

БЕЗ ШАНЦУ НА ГЛЫТОК ПАВЕТРА

4-5

НЯКНІЖНЫ СВЕТ?

13



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

25 САКАВІКА 2023 г. СУБОТА № 57 (29937)

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Ігар ПЕТРЫШЭНКА, намеснік прэм'ер-міністра:**

*«На фоне аспектаў, звязаных з COVID-19, мы ўбачылі, што ўнутраны турызм актывізаваўся, людзі сталі больш ездзіць па краіне. Інфраструктура ў нас добрая, яна падцягваецца пад патрэбы нашых грамадзян. Усё зроблена для камфорту турыстаў. У краіне развіваюцца самыя розныя напрамкі, у тым ліку прамысловы, аздараўленчы, медыцынскі, адукацыйны турызм. У мінулым годзе мы ўзмацнілі турыстычны напрамак ва ўсіх рэгіёнах, у прыватнасці на ўзроўні кожнага раёна створана каардынацыйная структура. Турызм дае пэўную прыбаўку ў валавы рэгіянальны прадукт. Таксама мы рэалізоўваем новыя ініцыятывы ў кожным з нашых рэгіёнаў, якія дазволяць прыцягнуць як унутраных турыстаў, так і турыстаў з дружалюбных нам дзяржаў, у першую чаргу РФ, Узбекістана і іншых краін СНД, Кітая».*

# «ПАПАРАЦЬ» КВІТНЕЕ КРУГЛЫ ГОД



Фота БелТА.

У Дзіцячай школе мастацтваў № 2 Бярозы захоўваюць традыцыю роспісу па шкле. Сваё ўменне майстры перадаюць дзецям у студыі «Папараць». Юныя мастакі з радасцю вучацца асвойваць новыя тэхнікі роспісу. У Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцяў ад Брэсцкай вобласці ўключаны 23 аб'екты нематэрыяльнай культурнай спадчыны. Па іх колькасці рэгіён займае першае месца ў краіне. Найбольш такіх аб'ектаў у Бярозаўскім раёне — там статус гісторыка-культурнай каштоўнасці атрымалі шэсць элементаў нематэрыяльнай спадчыны, у тым ліку роспіс па шкле.

**На здымку:** кіраўнік узорнай студыі «Папараць» Таццяна ЗДАНЕВІЧ паказвае вучням сакрэты ўнікальнага мастацтва.

Камандзіроўка па пісьме

## «А ШТО РАБІЦЬ МНЕ?»

### Наколькі рэальна сёння забяспечыць безбар'ернае асяроддзе інваліду-калясачніку ў невялікім райцэнтры



**У рэдакцыю прыйшло пісьмо ад Ірыны Падліпскай з Івацэвіч. Інвалід першай групы ў лютым мінулага года атрымала арэндную кватэру, праўда, потым яе ўключылі ў склад жылых памяшканняў сацыяльнага карыстання. Жыллё размешчана на першым паверсе дома, ёсць усе выгады. Здавалася б, добра. Але ў доме пабудовы пачатку 1970-х гадоў зусім адсутнічае безбар'ернае асяроддзе.**

СТАР. 7

Камунальныя стасункі

## Камфорт для беларусаў праз законы ў сферы ЖКГ

### Камунальнікі ведаюць і гатовы задаволіць патрэбы людзей

**Работнікі сферы ЖКГ паказалі неблагія вынікі працы ў галіне, а самае галоўнае — паляпшаецца даступнасць, якасць і аператыўнасць аказання жыллёва-камунальных паслуг (ЖКП), ахарактарызаваў леташнюю дзейнасць свайго ведамства міністр ЖКГ Андрэй ХМЕЛЬ. Ён расказаў пра планы камунальнікаў па забеспячэнні беларусаў чыстай вадой, выкананні капрамонту, дзейнасці таварыстваў уласнікаў, а таксама пра новаўвядзенні ў законы, якія паспрыяюць павелічэнню камфортнага жыцця людзей і забеспячэнню іх патрэб. «Будзем працаваць далей і рабіць жыццё лепшым, прыгажэйшым, больш камфортным, думаю, людзі ў нас не расчаруюцца», — паабяцаў міністр напярэдадні прафесійнага свята ЖКГ.**

СТАР. 3

## КОРАТКА

- **У Беларусі на вясновыя палявыя работы спатрэбіцца амаль Br3 млрд.**
- Нацыянальны аэрапорт Мінск з 26 сакавіка пераходзіць на вясенне-летні расклад палётаў.
- **Сярэдні заробак у Беларусі ў лютым склаў Br1687,8.**
- У нашай краіне за мінулы год высаджана больш за 590 тысяч дрэў і каля 530 тысяч кустоў.

ISSN 1990 — 763X

23057

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

Падпішыся на «Звязду» – і выйграй карысны прыз!

Ідзе падпіска на II квартал 2023 года

ВЯСНА І ЛЕТА — З ЛЮБІМАЙ ГАЗЕТАЙ!

Энергетыка

# Аб'яднаныя рынкі, атамнае супрацоўніцтва і электратранспарт

## Беларускія і расійскія парламентарыі пра развіццё саюзных праграм

**Гэты год стане вызначальным у рэалізацыі маштабных праектаў па стварэнні агульных беларуска-расійскіх энергарынкаў. Саюзная праграма прадугледжвае, што аб'яднаны рынак электраэнергіі запрацуе з 1 студзеня 2024-га і энергія з БелАЭС (выпрацавана ўжо амаль 13 млрд кВт·г) будзе пастаўляцца на расійскі рынак, а з 2027-га адбудзецца больш глыбокая інтэграцыя. Больш за палову мерапрыемстваў саюзных праграм у сферы энергетыкі ўжо выканана, а далейшае атамнае супрацоўніцтва дзвюх краін будзе пашырана не толькі пытаннямі эксплуатацыі БелАЭС і абыходжання з радыеактыўнымі адходамі, але і новымі напрамкамі. Энергетычнае супрацоўніцтва Беларусі і Расіі ў межах Саюзнай дзяржавы абмеркавалі падчас рабочага візіту дэлегацыі дэпутатаў Дзяржднумы Расіі з беларускімі калегамі з Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу і Міністэрства энергетыкі Беларусі.**



### Двухбаковая выгада і стратэгія

Супрацоўніцтва Беларусі і Расіі ў эканоміцы і энергетыцы мае стратэгічны характар і пашыраецца па ўсіх напрамках, тым самым дазваляючы эфектыўна супрацьстаяць знешняму ціску, мяркуе **міністр энергетыкі Віктар КАРАНКЕВІЧ:**

— Яшчэ напрыканцы мінулага года прэзідэнты Беларусі і Расіі пацвердзілі курс на далейшае пашырэнне інтэграцыі ў межах Саюзнай дзяржавы, у тым ліку і ў энергетычнай галіне. Дасягнутыя дамоўленасці аб цэнавых умовах паставак у Беларусь расійскага газу на тры гады, абазначаны прыярытэты рэалізацыі саюзных праграм па стварэнні аб'яднаных рынкаў энергарэсурсаў. Створана неабходная нарматыўна-прававая база для актыўнага развіцця і паглыблення інтэграцыйных працэсаў у энергетыцы, сінхранізавана работа энергасістэм, рэалізаваны важныя сумесныя праекты, найбуйнейшы з якіх — будаўніцтва БелАЭС. Летась напрыканцы вясны ўступіла ў сілу міжурадавае пагадненне аб супрацоўніцтве ў галіне транспарціроўкі ядзерных матэрыялаў, а ўвосень падпісана міжурадавае пагадненне па абыходжанні з адпрацаваным ядзерным палівам БелАЭС. Паліўна-энергетычны комплекс Саюзнай дзяржавы працуе стабільна і забяспечвае дынамічнае развіццё нацыянальных эканомік.

Палова галіновых праграм паміж нашымі дзяржавамі ўжо выканана, а па ўзаемадзеянні ў атамнай сферы бакі плануюць выйсці на больш высокі ўзровень супрацоўніцтва. Краіны рухаюцца на шляху вырашэння пытанняў аб стварэнні аб'яднаных рынкаў газу і электраэнергіі. Ужо адпрацаваны на міжведамасным узроўні і цяпер праходзяць унутрыдзяржаўныя працэдуры ўзгаднення праекты асноватворных дакументаў — міждзяржаўнага дагавора аб фарміраванні аб'яднанага рынку электраэнергіі, а таксама правіл яго функцыянавання. У стадыі адпрацоўкі — адзіныя прынцыпы функцыянавання і рэгулявання аб'яднанага рынку газу.

— Для нас важна, каб гэтыя дакументы не проста забяспечылі будучае развіццё агульных рынкаў энергарэсурсаў, парадак нашай сумеснай работы, але і збліжэнне ўмоў для суб'ектаў гаспадарання дзвюх краін. Гэта прынцыповая пазіцыя беларускага боку, — адзначыў Віктар Каранкевіч.

Ён дадаў, што разлічвае на падтрымку парламентарыяў у справе прасоўвання саюзных праграм у частцы выпрацоўкі прапаноў па імплементацыі прынятых саюзных рашэнняў у нацыянальныя і ведамасныя праграмы, а таксама ў частцы далейшага ўдасканалення заканадаўчай базы, стварэння камфортных эканоміка-прававых умоў для развіцця двухбаковага супрацоўніцтва ў электраэнергетыцы і газавай галіне.

— Энергетыка — адна з найважнейшых сфер эканамічнага супрацоўніцтва нашых краін, а адносіны стратэгічнага партнёрства правераны часам, — перакананы **Павел ЗАВАЛЬНЫ, старшыня камітэта Дзяржднумы па энергетыцы.** — Знешні ціск на Расію і Беларусь стварае не толькі цяжкасці, але і магчымасці, у тым ліку для ўмацавання нашага супрацоўніцтва ва ўсіх сферах энергетыкі.

### Газавая гарманізацыя

Падчас сустрэчы парламентарыі Беларусі і Расіі абмеркавалі пытанні, датычныя магчымых правіл фарміравання агульнага рынку газу, мэтазгоднасці ўвязвання тэрмінаў запуску рынкаў электраэнергіі і газу паміж сабой, а таксама спецыфічных пытанняў нацыянальнага энергетычнага рэгулявання абедзвюх дзяржаў. Бакі перакананы, што неабходны адзіныя падыходы і паглыбленне інтэграцыі, якія павінны паляпшаць умовы гаспадарання для эканамічных суб'ектаў абедзвюх краін і садзейнічаць развіццю эфектыўнай канкурэнцыі ў роўных умовах. А мадэлі, якія будуць распрацаваны ў межах Саюзнай дзяржавы, могуць стаць узорам для эканамічнай інтэграцыі ў ЕАЭС.

Датычна саюзнай праграмы па фарміраванні аб'яднанага рынку газу пакуль існуюць рознагалоссі адносна доступу да спажыўцоў, тарыфаў на транспарціроўку і цэнаўтварэнне. Аднак парламентарыі дзвюх краін спадзяюцца, што дасягнуць паразумення.

— Прамыя міжпарламенцкія кантакты, адкрыты і канструктыўны дыялог па самых складаных пытаннях дазволяць зблізіць пазіцыі і ў найбліжэйшыя два гады завяршыць нарматыўную падрыхтоўку стварэння адзінага рынку энергарэсурсаў Саюзнай дзяржавы, а таксама агульнага рынку энергарэсурсаў ЕАЭС, у які ўваходзяць нашы дзяржавы, — упэўнены Павел Завальны. — Работа па збліжэнні пазіцый планамерна вядзецца на міжміністэрскім узроўні, а прамыя міжпарламенцкія кантакты таксама з'яўляюцца эфектыўным інструментам, каб зняць супярэчнасці. Камітэт Дзяржднумы па энергетыцы гатовы актыўна працаваць у гэтым кірунку.

Беларускі бок згодны, што краінам трэба знайсці развязкі па шэрагу пытанняў і завяршыць асноўную работу над пакетам міжурадавых пагадненняў у газавай сферы.

— Хоць асноўныя дакументы па агульным рынку электраэнергіі ўзгоднены, аднак паўнавартасна працаваць гэты рынак зможа толькі тады, калі будуць зразумелымі правілы функцыянавання агульнага рынку газу з улікам долі газу ў генерацыі электраэнергіі ў Беларусі, — лічыць **Аляксей КУШНАРЭНКА, старшыня камісіі Парламенцкага сходу Саюза Беларусі і Расіі па энергетыцы і транспарце.** — Важна дасягнуць дамоўленасцяў дзвюх дзяржаў па пытанні цаны на газ для Беларусі на 2023—2025 гады, паколькі гэта стварае зразумелыя ўмовы гаспадарання для беларускіх спажыўцоў на тры гады наперад.

### Неэнергетычнае супрацоўніцтва і атамнае імпартазамяшчэнне

Саюзная праграма па развіцці атамнай энергетыкі ў частцы сінхранізацыі прававых пытанняў уводу ў эксплуатацыю ядзерных аб'ектаў завершана, аднак яна застаецца ў фокусе ўвагі камісіі Парламенцкага сходу Саюза Беларусі і Расіі па энергетыцы і транспарце, гэтаксама як і тры саюзныя праграмы па фарміраванні агульных рынкаў энергарэсурсаў і дзве праграмы транспартнай тэматыкі. Краіны гатовы актыўна супрацоўнічаць па неэнергетычных напрамках прымянення ядзерных тэхналогій. Гэта лічбавыя тэхналогіі, назапашвальныя сістэмы для энергетыкі і электратранспарту, даследаванні ў галіне радыебіялогіі.

— Акрамя непасрэдна атамнай галіны, будуць развівацца і іншыя напрамкі супрацоўніцтва з дзяржкарпарацыяй «Расатам»: у медыцыне, навуцы, сельскай гаспадарцы, — падкрэсліў **Міхаіл МІХАДЗЮК, намеснік міністра энергетыкі Беларусі.** — Беларускі бок плённа супрацоўнічае з расійскімі калегамі па пытаннях бяспечнай эксплуатацыі АЭС і абыходжання з адходамі ядзернага паліва.

Расія гатовая падзяліцца з Беларуссю сваімі апошнімі напрацоўкамі ў сферах новых матэрыялаў і тэхналогій, энергетычнага машынабудаўніцтва, ветраэнергетыкі, штучнага інтэлекту, ядзернай медыцыны і іншых у інтарэсах развіцця інтэграцыйных працэсаў дзвюх краін, пагадзіўся Павел Завальны:

— Адзін з магчымых напрамкаў узаемадзеяння — пашырэнне прымянення газаматорнага паліва, стварэнне грузавога, пасажырскага, воднага транспарту на прыродным газе і ўдзел прамысловасці Беларусі ў паскораным імпартазамяшчэнні ва ўсіх галінах энергетыкі Расіі.

Наведваючы Беларускую АЭС, парламентарыі дамовіліся аб супрацоўніцтве ў сферы імпартазамяшчэння ў атамнай энергетыцы. Цяпер абодва бакі ўжо прапрацоўваюць дакладныя сферы ўзаемадзеяння, а Дзяржкарпарацыя «Расатам» стварае новы дывізіён — фізічнай інфраструктуры, расказаў **намеснік старшыні камітэта Дзяржднумы Расіі па прамысловасці і гандлі Генадзь СКЛЯР:**

— Ва ўмовах санкцый мы знойдзем магчымасць, каб праекты АЭС былі забяспечаны ўсёй лінейкай абсталявання. Ад кампанентаў мікраэлектронікі, якія ствараюцца ў Беларусі, да відаў абсталявання, прылад, якія ўжо вырабляюцца ці могуць ствараціца ў Расіі, мы атрымаем сучасную эфектыўную сістэму кіравання гэтымі складанымі аб'ектамі.

Удзельнікі сустрэчы адзначылі важнасць завяршэння ў найбліжэйшыя два гады нарматыўнай падрыхтоўкі стварэння адзінага рынку энергарэсурсаў Саюзнай дзяржавы, а таксама агульнага рынку энергарэсурсаў ЕАЭС, куды ўваходзяць абедзве краіны.

**Ірына СІДАРОК.**

**Фота дадзена камітэтам па энергетыцы Дзяржднумы Федэральнага сходу Расіі.**

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### КНДР выпрабавала падводны беспілотнік, які здольны праводзіць ядзерныя атакі



КНДР правяла выпрабаванні стратэгічных крылатых ракет серыі «Хвасаль» з доследнымі боегалоўкамі, якія імітуюць ядзерны зарад. Пра гэта паведаміла дзяржаўнае радыё «Голас Карэі». Як зазначаецца ў паведамленні, прайшлі вучэнні, «якія мелі на мэце навучыць часці, узброеныя стратэгічнымі крылатымі ракетамі, парадку і працэсу выканання задач па тактычным ядзерным нападзенні». Адзначаецца, што падчас вучэнняў былі запушчаны чатыры ракеты серый «Хвасаль-1» і «Хвасаль-2». Яны праляцелі адлегласць ад 1500 да 1800 км над Японскім морам і накрылі ўмоўныя цэлі. Адна з ракет была падарвана на вышыні 600 метраў, каб «праверыць надзейнасць работы сістэм кіравання ядзерным выбухам і прылад імітацыі» ядзернай боегалоўкі. Выпрабаванні, паводле паведамлення радыё, не аказалі негатыўнага ўплыву на бяспеку суседніх краін.

### Колькасць затрыманых на акцыях пратэсту ў Францыі перавысіла 450 чалавек



Колькасць затрыманых на дэманстрацыях супраць пенсіённай рэформы ва ўсёй Францыі ўзрасла да 457. Такія звесткі прывёў міністр унутраных спраў Францыі Жэральд Дарманен у эфіры тэлеканала CNews. Ён таксама звярнуў увагу, што 441 супрацоўнік паліцыі і жандармерыі атрымаў траўмы падчас сутыкненняў з пратэстоўцамі. Дарманен дадаў, што ў Парыжы зафіксавана «933 выпадкі падпалу гарадской маёмасці і смеццевых кантэйнераў». Кіраўнік МУС выказаў занепакоенасць «радыкалізацыяй» пратэснага руху. Паводле яго слоў, за гэты тыдзень Генеральная інспекцыя нацыянальнай паліцыі Францыі пачала 11 расследаванняў, звязаных з дзеяннямі пратэстоўцаў падчас акцый. Як вядома, у Парыжы і шэрагу іншых гарадоў Францыі прайшлі масавыя пратэсты супраць пенсіённай рэформы, якія пераraslі ў беспарадкі. Удзельнікі акцый кідалі камяні, бутэлькі з запальнай сумессю ў сілавікоў. У Бардо пратэстоўцы падпалілі ўваход у мэрыю, а ў Тулузе і Ліёне яны ўчынілі пагромы.

### Пасля землетрасенняў у Турцыі ўтварылася звыш 100 мільёнаў тон абломкаў і смецця



У Турцыі праводзяць работы па выдаленні 101 мільёна тон смецця і абломкаў пасля лютаўскіх землятрусаў, паведаміла газета Hurriyet. У міністэрстве навакольнага асяроддзя, горадабудаўніцтва і змены клімату заявілі, што аб'ём абломкаў і смецця, пакінутых пасля землетрасенняў, якія адбыліся 6 лютага, складае прыкладна 46 млн кубаметраў. Толькі ў паўднёвай правінцыі Хатай будзе выдалена больш за 16 млн тон смецця. Чыноўнікі паведамляюць, што не менш як 2,5 млн тон смецця і абломкаў можна адправіць на перапрацоўку. Міністэрства навакольнага асяроддзя таксама ўвесь час правярае наяўнасць і колькасць азбесту на месцы работ, каб выключыць забруджванне паветра.

Жыхары моцна пашкоджаных і разбураных дамоў змогуць атрымаць назад свае каштоўныя рэчы. Іх будуць даставаць з-пад абломкаў у першую чаргу і перадаваць уладальнікам.

# «Палац Незалежнасці паказвае, што беларусы здольныя на ўсё»

**Спраўдзілася адна з мар некалькіх дзясяткаў актыўных школьнікаў з Брэсцкай вобласці — яны наведалі Палац Незалежнасці. Напрыканцы мінулага года ўдзельнічалі ў конкурсах, падчас якіх вывучалі выступленні Прэзідэнта, выбіралі самыя трапныя цытаты і аналізавалі іх значэнне. Таму магчымасць пабываць у залах, дзе гучаць гэтыя цытаты і прымаюцца найважнейшыя рашэнні, па прызнанні школьнікаў, стала для іх сапраўдным падарункам. Як вядома, па асабістым распараджэнні кіраўніка дзяржавы Палац Незалежнасці адкрыты для гасцей. Экскурсантаў тут заўсёды рады бачыць, а такіх актыўных, ініцыятыўных і амбіцыйных — тым больш.**

Дарэчы, важнай часткай конкурсу сталі і творчыя работы, у якіх маладыя людзі выкладалі свае погляды на ўдасканаленне пэўнай сферы грамадскага і палітычнага жыцця. Тым больш што некаторыя з іх у будучыні плануюць звязаць з гэтым сваё прафесійнае жыццё. «Я ўпершыню ўбачыў настолькі грандыёзны і маштабны будынак. Спадзяюся, у будучыні буду прыходзіць сюды на працу як палітык», — падзяліўся амбіцыямі Ілья Мядзвецкі, вучань дзявятага класа гімназіі горада Камянца. Паколькі вялікімі палітыкамі не становяцца, а нараджаюцца, у сваім юным узросце Ілья на важныя для краіны тэмы разважае як дарослы дасведчаны чалавек. Ну і атмасфера дапамагае. «У сваёй творчай рабоце я хацеў паказаць людзям, што мы павінны памятаць сваіх продкаў і не забываць аб іх вялікім унёску ў перамогу ў Вялікай Айчыннай вайне. Калі б не яны, мы б цяпер не жылі пад мірным небам, не жылі б спакойна ў сваіх цудоўных гарадах і наогул не існавалі б. Мы любім сваю краіну, свой родны горад, яны ў нас у сэрцы», — падкрэсліў будучы палітык. З ім пагадзіўся і яго аднакласнік Раман Алексяюк. «Беларусы ўсяго дасягаюць самастойна, яны разлічваюць толькі на сябе пры вырашэнні складаных пытанняў. Беларусы здольныя на ўсё. І мы гэта бачым у Палацы Незалежнасці. Я не чакаў такога вялікага маштабу, усёй раскошы. Гэта сапраўды грандыёзна. І вельмі прыемна, што гэта зроблена нашымі людзьмі».


Фота БелТА.

Насамрэч з заламі Палаца Незалежнасці знаёмы кожны, хто цікавіцца жыццём краіны і глядзіць навіны. Але ж адна справа — бачыць гэтыя інтэр'еры па тэлевізары ці на фотаздымках, а зусім іншая — ужывую. «Чаканні перасягнулі рэальнасць. Калі глядзіш па тэлевізары — уражвае, а калі бачыш ужывую — адчуваеш зусім іншыя эмоцыі: уражвае інтэр'ер і атмасфера. Хочацца пабыць тут як мага даўжэй», — сказала Паліна Бурвіна, вучаніца Белавежскай сярэдняй школы Камянецкага раёна.

Падчас экскурсіі гасцям расказваюць цікавую прыкмету: той, хто зробіць фатаграфію ў зале, дзе Прэзідэнт уручае дзяржаўныя ўзнагароды, абавязкова вернецца сюды па вялікую ўзнагароду. Памятны фотаздымак зрабіў кожны. «Я хачу, каб у будучыні мне тут уручылі дзяржаўную ўзнагароду і хачу паціснуць руку Прэзідэнту. Я ўдзельнічаю ў алімпіядах па англійскай і рускай мовах, займаюся танцамі, вучуся на фізмаце і хачу паступіць у БДУІР. Спадзяюся, мае разнастайныя заняткі і цікаўнасць прывядуць мяне да мары», — адзначыла Ясенія Семянчук з Брэста.

Экскурсіі ў Палац Незалежнасці цікавыя і тым, што гэтае месца — не проста рабочая рэзідэнцыя Прэзідэнта, але і культурная пляцоўка. Адначасова з вялікімі палітычнымі мерапрыемствамі тут праходзяць і культурныя падзеі. Самыя папулярныя — выстаўкі сучасных беларускіх мастакоў. У лютым была прадстаўлена выстаўка «УМираТворение» мастака Міхаіла Крата. Невялікія вясковыя вуліцы, родныя беларускія пейзажы, з дзяцінства знаёмыя колеры — тое, што заўсёды адгукаецца ў сэрцы. Падчас гэтай экскурсіі школьнікі мелі магчымасць пазнаёміцца з мастаком Міхаілам Кратом асабіста.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

# Камфорт для беларусаў праз законы ў сферы ЖКГ

*Прэзідэнт Беларусі павіншаваў работнікаў ЖКГ з прафесійным святам. «Ваша шматгранная дзейнасць па стварэнні і падтрымцы парадку і камфорту ў дамах, гарадах, вёсках, пасёлках, па прафесійным і якасным рашэнні бытавых пытанняў вельмі патрэбная людзям. У многім дзякуючы менавіта вам чыстыя добраўпарадкаваныя населеныя пункты, зялёныя і ўтульныя двары, паркі, скверы даўно сталі візіткай Беларусі», — гаворыцца ў віншаванні.*

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Калі кожны жыхар краіны будзе ведаць і бачыць, што заплачаныя ім за жыллёва-камунальныя паслугі грошы ідуць у справу, то інакш паставіцца да работы камунальнікаў, стане давяраць ім і, пэўна, сябраваць. Аднак самае галоўнае — своечасовы водгук на запыты і звароты грамадзян, празрыстасць і прафесіяналізм, бо работнікі ЖКГ працуюць на карысць людзей, дадаў міністр.

Для сферы ЖКГ мінулы год, як звычайна, быў няпросты. Тым не менш камунальнікі дасягнулі неблагіх вынікаў у вырашэнні задач, пастаўленых праграмай «Камфортнае жыллё і спрыяльнае асяроддзе», заўважыў Андрэй Хмель:

— Знізілася колькасць зваротаў грамадзян на няякаснае аказанне паслуг. Гэта асноўны паказчык, бо галоўныя, хто нас ацэньвае, — людзі, нашы спажыўцы. Цяпер задача — трымаць планку, рухацца далей наперад і развівацца. Працягнецца работа па забеспячэнні грамадзян якаснай пітной вадой. Мы прыкладзём усе намаганні, каб выканаць заданне па капрамонце жыллёвага фонду. Сёлета будуць дадаткова выдзелены сродкі на ўтрыманне ў належным стане пакрыцця дарог населеных пунктаў, 50 мільёнаў рублёў накіравана і на рамонт дахаў. Гэта асноўныя чаканні і патрэбы людзей у частцы камфортнага пражывання і эксплуатацыі жыллёвага фонду, мы іх ведаем і плануем выканаць.

У канцы мінулага года адбыліся сур'ёзныя змены ў заканадаўстве. У прыватнасці, быў прыняты Закон «Аб дзяржаўных закупках у жыллёва-камунальнай гаспадарцы», які цяпер дазваляе назначаць падрадчыкаў на цэлы пералік работ без правядзення працэдуры закупак. Гэта, безумоўна, паскорыць працэс як прыняцця рашэнняў, так і выканання саміх работ, звязаных з аказаннем ЖКП. Ужо сёлета гэты закон будзе паказваць вынікі, лічыць Андрэй Хмель:

— Цяпер разглядаюцца пытанні, датычныя паслуг водазабеспячэння і водаадвядзення, таму што мы бачым пэўныя праблемы. У праграме «Чыстая вада» хочам развіваць больш сетак, каб больш людзей атрымлівалі якасныя паслугі. Каб арганізацыі, якія аказваюць паслугі водазабеспячэння і водаадвядзення, увайшлі і ў садовыя таварыствы, каб якасць паслуг тут таксама была на належным узроўні. Разглядаецца і пытанне аб дзейнасці таварыстваў уласнікаў (прапрацоўваецца адпаведны законапраект). Гэта неадназначнае і важнае пытанне, і многія людзі звяртаюцца па гэтай тэме. Адпрацоўваецца і шэраг іншых напрамкаў, важных для беларусаў.

Перадсвяточны дзень для камунальнікаў не стане нагодай для адпачынку — сёння яны традыцыйна выйдуць на суботнікі, у якіх да канца красавіка могуць паўдзельнічаць усе ахвотныя дапамагчы навесці парадак на зямлі і зрабіць нашы мястэчкі прыгажэйшымі.

**Ірына СІДАРОК.**

# СУЧАСНАЕ АБЛІЧЧА І ЗРУЧНАСЦЬ ДЛЯ ГАРАДЖАН

## Магілёўскі Галоўпаштамт абнавілі

**Апошнім этапам глабальнай рэканструкцыі, якая працягвалася болей чым тры гады, стала мадэрнізацыя Галоўнага паштовага аддзялення сувязі № 30. Перад гэтым уцяплілі будынак, замянілі інжынерныя сеткі, зрабілі рамонт даху. Атрымаўся цалкам адноўлены аб'ект. Зараз аддзяленне № 30 не пазнаць. Яно стала больш прасторным, светлым, а галоўнае — функцыянальным.**



— Мы выразна выдзелілі зону чакання для кліентаў і рабочую зону з шасцю працоўнымі месцамі, — звяртае ўвагу **намеснік дырэктара Магілёўскага філіяла РУП «Белпошта» Галіна МАРЧАНКА.** — Прыкметна павялічылася паштовая крама, дзе з'явіўся нават куточак для стасункаў посткросераў і філатэлістаў. Тут жа можна набыць тавары дзяржаўнай сімволікі — іх асартымент значна пашыраны. Для персаналу створаны зручныя рабочыя месцы, абсталяваны пакой для прыёму ежы.

У аддзяленні ўстаноўлена сучаснае камп'ютарнае абсталяванне з высокатэхналагічным праграмным забеспячэннем. Паскорыць абслугоўванне кліентаў дапамогуць і плацежна-даведачныя тэрміналы. Створаны ўсе ўмовы, каб наведвальнікі маглі хутка і якасна атрымаць неабходны комплекс паслуг. Акрамя разнастайнай паштовай прадукцыі, установа прапануе тавары спажывецкага попыту як прадуктовыя, так і прамысловыя.

У адкрыцці абноўленага аддзялення прынялі ўдзел старшыня Магілёўскага гарвыканкама Аляксандр Студнеў, старшыня гарсавета дэпутатаў Максім Гурын, намеснік генеральнага дырэктара РУП «Белпошта» Вадзім Герасімёнак, намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама Валерый Малашка. Разам з дырэктарам Магілёўскага філіяла «Белпошты» Аляксандрам Бручыкавым яны падпісалі памятныя паштоўкі з пасланнем будучаму Магілёва, чым далі старт рабоце абноўленага Галоўпаштамта.

Паштавікі вельмі трапятліва ставяцца да гісторыі свайго ведамства. Адлік яе вядзецца з часоў Кацярыны Вялікай, якая 250 гадоў таму дала дазвол на заснаванне паштовай установы ў Магілёўскай губерні. Шмат цікавага звязана з адкрыццём будынка Галоўпаштамта ў Магілёве. Захаваліся фота і асабістыя рэчы начальніка тады яшчэ магілёўскай паштовай канторы Ульяна Булыбенкі, які ўзначаліў яе ў 1948 годзе. Пры ім і ўзводзіўся вось гэты будынак, які расчыніў свае дзверы ў 1962 годзе. Пры ведамстве была нават свая майстэрня па вытворчасці мэблі. А асвятлялі паштовае памяшканне свяцільнікі маскоўскага метрапалітэна.

Шмат чаго цікавага можна знайсці, калі пагартаць фотаальбом перыяду стварэння Галоўпаштамта. Берагуць паштавікі і нумар газеты «Магілёўская праўда», якая пісала пра адкрыццё такога значнага для Магілёва аб'екта.



Сёння аддзяленне паштовай сувязі № 30 абслугоўвае каля 30 тысяч чалавек. Штомесячна ім апрацоўваецца каля 90 тысяч адпраўленняў простай пісьмовай карэспандэнцыі, болей чым 12 тысяч заказных адпраўленняў, каля 300 каштоўных лістоў, 3000 пасылак і 2000 адпраўленняў паскоранай пошты. Паштальёны аддзялення дастаўляюць падпісчыкам прыблізна 20 тысяч экзэмпляраў друкаваных выданняў.

— Галоўпаштамт — вельмі важны аб'ект для Магілёва, месца прыцяжэння гараджан, — падкрэсліў у размове з журналістамі **старшыня Магілёўскага гарвыканкама Аляксандр СТУДНЕЎ.** — Адбылася істотная рэканструкцыя будынка, у выніку якой з'явіліся зручныя ўмовы для работы супрацоўнікаў і абслугоўвання гараджан. Тут усё створана для таго, каб кліент мог атрымаць увесь комплекс паштовых паслуг. Абноўлены аб'ект стаў яшчэ адным упрыгожваннем горада.



Да адкрыцця аддзялення была прымеркавана віктарына на веданне гісторыі пошты з уручэннем памятных сувеніраў, прэзентацыя паштовых марак з дапоўненай рэальнасцю. Была магчымасць бясплатна пераслаць паштовую картку і сфатаграфавацца на памяць з гістарычнымі асобамі.

**Нэлі ЗІГУЛЯ, фота аўтара.**

# АБЕЛІСКІ ПАРАНЕНАЙ ЗЯМЛІ

# Без шанцу на глыток паветра

## Відэакадры масавага забойства пацыентаў у магілёўскай псіхіятрычнай бальніцы фігуравалі ў абвінавачванні супраць фашыстаў на Нюрнбергскім працэсе

**У чорнай, скрыўленай прасторы — фігура чалавека, які цягнецца да акна. Ён ловіць выратавальны глыток паветра, але сілы хутка пакінуць... Гэты памятны знак у гонар пацыентаў Магілёўскай абласной псіхіятрычнай бальніцы, якіх знішчылі немцы падчас фашысцкай акупацыі абласнога цэнтра ў 1941—1942 гадах, зроблены па ініцыятыве беларускіх і нямецкіх медыкаў. Яго аўтар — магілёўскі скульптар Аляксандр Мінькоў, які перамог у прысвечаным гэтай тэме конкурсе. Яго эскіз быў аднагалосна падтрыманы журы з беларускага і нямецкага бакоў. Падчас Вялікай Айчыннай вайны пацыентаў Магілёўскай псіхіятрычнай бальніцы мэтанакіравана забівалі вокісам вугляроду. Па розных даных, загінула каля 1500 чалавек. Памятны знак такога кшталту, напэўна, адзіны ў Беларусі і другі ў свеце. Яшчэ адзін знаходзіцца ў Германіі, краіне, дзе і была распрацавана бесчалавечная ідэя эўтаназіі псіхічнахворых людзей.**



Алена ЛАЗАРЭНКА апякуецца захаваннем памяці пра пацыентаў і ўрачоў, забітых фашыстамі.

### Страчаная гісторыя

**Намеснік галоўнага ўрача Магілёўскай абласной псіхіятрычнай бальніцы Алена ЛАЗАРЭНКА** на працягу больш чым 30 гадоў аднаўляе гісторыю адной з найбуйнейшых да вайны ў Беларусі псіхіятрычных бальніц рэспубліканскага значэння, якой на той перыяд была гэта ўстанова.

— Калі я, яшчэ зусім малады ўрач, прыйшла працаваць у найстарэйшую рэспубліканскую псіхіятрычную бальніцу і сутыкнулася з тым, што з яе гісторыі не захавалася амаль ніякай інфармацыі, адразу ж уключылася ў даследчую справу, — расказвае Алена Васілеўна. — Іншыя медыцынскія ўстановы выдаюць сабе брашуры, а ў нас нічога няма. І гэта пры тым, што датай заснавання нашай псіхбальніцы лічыцца 1802 год, калі тут яшчэ жылі манахі, якія і ўзялі пад апеку першых няшчасных. У 1804 годзе ў Магілёве адкрылася псіхіятрычнае аддзяленне гарадской бальніцы хуткай дапамогі, якое ў 1810 годзе атрымала статус бальніцы і размясцілася на базе былога Карабанаўскага архіерэйскага маёнтка. Да вайны на тэрыторыі магілёўскай псіхбальніцы знаходзіўся музей псіхіятрыі, найбагацейшая гісторыя была сабраная, меліся нават шафы, з дапамогай якіх да вайны ўціхамірвалі псіхічнахворых. У гады вайны гэты музей быў цалкам разгромлены і разрабаваны.

Даследчыца пачынала з агульнай гісторыі. Былы намеснік галоўнага ўрача абласной псіхіятрычнай бальніцы Валерый Бялянін даў ёй артыкулы, па якіх яна склала для сябе прыблізную храналогію. Яшчэ былі жывыя некалькі медработнікаў, відавочцы тых жахлівых ваенных падзей. Разам з галоўнай медыцынскай сястрой Ганнай Савуцінай маладая ўрач рабіла запыты ў розныя архівы, у тым ліку Беларускі нацыянальны архіў-музей гісторыі медыцыны, але нічога не знайшлося. А вось з маскоўскага архіва КДБ прыслалі паказанні асобных людзей і крыху матэрыялаў з Нюрнбергскага працэсу.

Так пачалася памалу раскрывацца самая трагічная старонка ў гісторыі бальніцы. Гэта вельмі натхніла на той момант маладога спецыяліста. Яна заўсёды лічыла, што яе абавязак перад калегамі і тымі людзьмі, якіх яны лячылі, сцерці «белыя» плямы, якія, на жаль, існуюць да сённяшняга дня. Празвішчы многіх з тых, хто загінуў ад рук фашыстаў, дагэтуль застаюцца невядомымі.



### Даведка

*Сакрэтная праграма эўтаназіі асоб з фізічнымі і псіхічнымі недахопамі Т4 (Aktion Tiergartenstraβe 4) стартавала ў Германіі ў 1939 годзе. Нямецкія нацыянал-сацыялісты выступалі за стэрылізацыю, а ў далейшым і фізічнае знішчэнне людзей з псіхічнымі расстройствамі, разумова адсталых і спадчынна абцяжараных хворых. «Мазгавым цэнтрам» акцыі Т4 было аддзяленне берлінскай рэйхсканцылярыі па адрасе Тыргантэнштрасэ, 4, з-за чаго і з'явілася спецыфічнае найменне праграмы. Фактычна ніякіх аглядаў хворых у большасці выпадкаў не праводзілася — дастаткова было тром экспертам на падставе анкеты пацыента напісаць «непаўнавартасны», і лёс яго быў вырашаны. У рамках рэалізацыі праграмы нямецкія ўрачы ўпершыню адпрацавалі забойства людзей у газавых камерах і на аўтамабільных платформах. У прыватнасці, падчас вайны ў Польшчы можна было бачыць смяротныя фургоны з надпісамі: «Імперскі кававы гешэфт».*

### Першыя ахвяры эўтаназіі

**З матэрыялаў Дзяржаўнага архіва Магілёўскай вобласці:**

*«Увосень 1941 года па загадзе афіцэра Магілёўскага гестапа капітана Прыпа ў адным з пакояў псіхбальніцы ніжняга паверха была ўладкаваная «душагубка» шляхам далучэння да аднаго з вокнаў газаправодных трубак ад аўтамашыны... У адзін з дзён па загадзе таго ж Прыпа ў душагубцы было атручана выхлапнымі газамі каля 700 псіхічнахворых. Падача газу ў пакой, у які заганялася па 70—80 чалавек, ажыццяўлялася па тых самых газаправодных трубках ад заведзенага матора машыны...»*

— Ахвярамі эўтаназіі на тэрыторыі Савецкага Саюза псіхічнахворыя магілёўскай псіхбальніцы станавіліся ўпершыню, — расказвае Алена Лазарэнка. — Фашысты шукалі танны спосаб забойства і вырашылі выкарыстоўваць выхлапны газ ад аўтамабіля. Спачатку падагналі легкавы аўтамабіль, але выхлапаў ад яго было недастаткова. Пацыенты доўга пакутавалі, нават у немцаў, якія глядзелі на гэта, нервы не вытрымлівалі. Таму надалей вырашылі выкарыстоўваць грузавы аўтамабіль. Медсястра Наталля Казакова, якую я яшчэ застала, расказвала пра тое, што медперсанал чуў, як крычалі за сцяной пацыенты. Яна казала, што знаходзілася ў сумежным пакоі з душагубкай і што ад плачу і крыку псіхічнахворых сціскалася сэрца. Калі выносілі іх трупы, яны ўсе мелі ненатуральную позу, былі скурчаныя, у рваным адзенні, пасчапляныя адно з адным, з надзьмутымі венамі на целе і фіялетавага колеру тварамі. Для выносу трупаў прыцягваліся спецыяльна прыгнаныя немцамі яўрэі. Работнікі бальніцы спрабавалі ратаваць псіхічнахворых, выводзілі за тэрыторыю бальніцы, але тыя нічога не разумелі і вярталіся зноў.

### З успамінаў відавочцаў

**Лізавета Лакцютка, да вайны старшая медсястра Магілёўскай рэспубліканскай псіхіятрычнай бальніцы:**

*«У верасні 1941 года ў санаторным аддзяленні бальніцы немцы ўчынілі душагубку і пачалі знішчаць хворых. Было атручана і забіта больш за 1000 чалавек. Пакінулі толькі пацыентаў з невялікім тэрмінам захворвання, без выяўленага дэфекту асобы. У кастрычніку 1941 года ў бальніцу прыйшоў працаваць нейрахірург Магілёўскай абласной бальніцы доктар Макар Куўшынаў, які падчас вайны ўзначаліў там антыфашысцкую падпольную арганізацыю. У яго атрымалася дамовіцца аб пераводзе некаторых хворых у абласную бальніцу, а частку выпісаць па дамах. Такім чынам было выратавана каля 40 чалавек. 24 ліпеня 1943 года Макар Куўшынаў разам з пацыентамі быў знішчаны ў душагубцы».*

### Атручвалі, забівалі токам, расстрэльвалі...

Гітлераўцы не цырымоніліся ў выбары спосабаў расправы з безабароннымі людзьмі. Адных атручвалі выхлапнымі газамі, дру-




гіх забівалі токам, трэціх вывозілі за горад і расстрэльвалі ў супрацьтанкавых равах. Захаваліся сведчанні Ганны Савуцінай, якая расказвала, што ў сярэдзіне ці канцы 1941 года некалькі соцень пацыентаў былі расстраляны немцамі ў Пашкаўскім лесе. Разам з імі, па яе словах, расстралялі і былога галоўнага ўрача бальніцы Меера Майсеевіча Кліпцана. «Там была выкапана вялікая яма, і некаторыя хворыя, верагодна, пападалі туды яшчэ жывымі і потым задыхаліся пад грузам мёртвых цел. Ва ўсякім разе супрацоўнікі бальніцы, якія шукалі там на наступны дзень расстралянага па іх здагадцы галоўнага ўрача, сцвярджалі, што зямля, якой былі прысыпаны загінулыя, «яшчэ дыхала».

Наогул, інфармацыі пра галоўнага ўрача Меера Кліпцана амаль не захавалася. Усё, што атрымалася пра яго знайсці, гэта тое, што ён з таго самага моманту, калі ў Магілёў прыйшлі немцы, хаваўся на гарышчы аднаго з будынкаў бальніцы. Супрацоўнікі насілі яму ежу і адзенне. Але знайшоўся здраднік. Немцы яго схапілі, пераапранулі ў бальнічнае адзенне і памясцілі сярод хворых 1-га псіхіятрычнага мужчынскага аддзялення. Потым разам з іншымі расстралялі.

— У фільме «Любоў зямная» ёсць вельмі кранальны эпізод, калі псіхічнахворы дапамагае ўрачу-псіхіятру сесці ў машыну, на якой яе разам з пацыентамі вязуць на расстрэл, — кажа Алена Лазарэнка. — У нас заўсёды казалі, што гэты эпізод створаны па расповедах пра нашу псіхбальніцу. Нашага галоўнага ўрача таксама пасадзілі ў машыну разам з хворымі і потым расстралялі. Сярод нашых супрацоўнікаў знайшоўся нелюдзь, які выдаў яго. Ён адсядзеў потым за гэтую здраду. Галоўнага ўрача штодзень вадзілі на допыты. Пасля першага ён вярнуўся па-зверску збітым, а на спіне піжамы была прышыта жоўтая зорка. У адзін са жнівеньскіх дзён, пасля чарговага допыту, Кліпцан паспеў папярэдзіць персанал, што рыхтуецца нешта страшнае і што ён бачыцца з імі апошні раз. І сапраўды, яго расстралялі.

Знайсці дакладнае месца, дзе гэта адбылося, не атрымалася. Як і даведацца пра яго сям'ю. Вядома толькі, што яна паспела эвакуіравацца з Магілёва.

## З матэрыялаў Дзяржаўнага архіва Магілёўскай вобласці:

*«У 1943 годзе восенню нямецка-фашысцкія захопнікі, маючы намер пазбавіцца ад слядоў сваіх злачынстваў па знішчэнні савецкага насельніцтва, у супрацьтанкавых ірвах вёскі Новае Пашкава праводзілі эксгумацыю і спаленне трупаў. Работы вяліся на працягу месяца, ёй займалася спецыяльна створаная з арыштаваных каманда. Па завяршэнні работ каманда была таксама знішчана і спалена, пра што ёсць сведчанні асобных асуджаных, у якіх атрымалася збегчы. Апошнія пацыенты Магілёўскай псіхіятрычнай бальніцы былі знішчаны зімой 1941—1942 гадоў. Пасля немцы разграбнулі ў памяшканнях псіхбальніцы свой шпіталь».*

## Імёны з небыцця

Пошукавая дзейнасць, разгорнутая Аленай Лазарэнкай, дапамагае аднавіць ваенныя падзеі. Яна метадычна прапрацоўвала кожнае імя, якое было звязана з мінулым бальніцы.

— На мае публікацыі ў СМІ адгукнулася сваячка Ганефы Гурэцкай, былой пацыенткі бальніцы, — расказвае ўрач. — На жаль, сустрэцца з ёй не атрымалася. Яна нечакана перастала выходзіць на сувязь. Потым стала вядома, што яна прадала кватэру і кудысьці з'ехала. Ганефу Пятроўну расстралялі ў 1941 годзе, ёй было прыкладна 31—34 гады, яна пражывала ў вёсцы Суцін Мінскай вобласці. У Расіі яшчэ жывы сын гэтай пацыенткі. У сям'і мала казалі пра псіхічную хваробу жанчыны, таму падрабязных звестак пра яе лёс няма. Вядома, што ў гады вайны згарэла хата і разам з ёй дакументы гэтай жанчыны і яе фота. Муж Гурэцкай расказваў сыну, што яны не паспелі забраць яе з бальніцы, але пазней, калі дабраліся ў акупаваны Магілёў, даведаліся ў мясцовых жыхароў, што яна была расстраляна ў рове недалёка ад бальніцы разам з іншымі.

У былой медсястры Ганне Савуцінай, якая дапамагала Алене Лазарэнцы аднаўляць ваенны перыяд гісторыі, атрымалася адшукаць жонку пацыента з Быхава Фёдара Карзо, які загінуў падчас расправы немцаў з хворымі. Карзо быў удзельнікам фінскай вайны 1939—1940 гадоў, атрымаў на фронце кантузію. На фоне гэтага ў яго пачаліся праблемы з псіхічным здароўем. Калі пачалася Вялікая Айчынная вайна, сваякі не паспелі яго адразу забраць з бальніцы, а калі прыехалі, было ўжо позна. Сын Фёдара Карзо быў вайскоўцам, памёр у 2007 годзе, а ўнук жыве і працуе ў Санкт-Пецярбургу.

Па словах відавочцы А. Кухаравай, сярод пакараных пацыентаў былі і іншыя ўдзельнікі «фінскай» вайны, але іх прозвішчы невядомы. Ёсць звесткі, што сярод расстраляных у Пашкаўскім лесе была і 40-гадовая жанчына з адной з вёсак Быхаўскага раёна. Яна трапіла ў псіхбальніцу на глебе пасляродавага псіхозу.

У пошуку сведкаў нямецкай расправы з пацыентамі і супрацоўнікамі бальніцы былі задзейнічаны і студэнты гістфака МДУ імя А. Куляшова, якія зацікавіліся гэтай гісторыяй. Яны абышлі мясцовасць, прылеглую да псіхбальніцы, і апыталі насельніцтва.

Ёсць успаміны Тацяны Цішынай, якая пацвердзіла, што псіхічнахворых расстрэльвалі ў супрацьтанкавым рове вёскі Новае Пашкава, які быў выкапаны пры абароне Магілёва. *«Пасля таго як роў быў запоўнены целамі забітых, немцы сагналі жыхароў вёсак Новае і Старое Пашкава, у тым ліку і дзяцей, закопваць трупы. Сярод іх была і мая маці. Расказвалі таксама, што з месца расстрэлу збегла псіхічнахворая маладая жанчына, якая называла сябе Наташа. Яна хадзіла па вёсцы і начавала дзе давядзецца: часам на магілках, часам у каго-небудзь з мясцовых жыхароў. У вёсцы яна знаходзілася даволі доўга, пакуль захоўвалася адносна цёплае надвор'е, пасля знікла невядома куды».*

## Немцы прапанавалі стварыць помнік

Прапанова ўшанаваць памяць закатаваных у душагубцы магілёўскай псіхбальніцы людзей прагучала менавіта з вуснаў немцаў. Яны таксама паабяцалі дапамогу ў пошуку фактаў па дадзеным злачынстве.

— Гэта было вельмі плённае супрацоўніцтва, — удакладняе Алена Лазарэнка. — Яно пачалося ў 1995 годзе, калі ў Магілёў прыехала група нямецкіх урачоў. Яны цікавіліся пытаннямі медыцыны, гісторыі, медыцынскай этыкі. Аснову дэлегацыі складалі ўрачы-псіхіятры і псіхолагі клінікі ўніверсітэта горада Хайдэльберг. Калі яны даведаліся, што ў нашай бальніцы фашысты праводзілі эўтаназію псіхічнахворых, то паабяцалі дапамагчы нам з інфармацыяй. У Германіі яны падзяліліся ўражаннямі з калегамі. Гэтымі фактамі зацікавіўся прафесар інстытута гісторыі і этыкі медыцыны тэхнічнага ўніверсітэта горада Мюнхена доктар псіхіятрычных навук Герыт Хаендорф. Ён працаваў у архівах Штазі міністэрства дзяржбяспекі ГДР і знайшоў дакументы, якія пацвердзілі факт знішчэння акупацыйнымі войскамі псіхічнахворых у Магілёве і псіхіятрычнай бальніцы ў Навінках пад Мінскам. Ён наткнуўся на відэаролік, які паказваўся на Нюрнбергскім працэсе. Усяго паўхвіліны, але гэта жывая хроніка. Нелюдзі цынічна здымалі на камеру жахлівыя моманты эўтаназіі хворых людзей у Навінках. Гэтыя кадры потым сталі дакументальным сведчаннем супраць іх на Нюрнбергскім працэсе.

Размова на гэтую тэму працягнулася на сумесным беларуска-нямецкім семінары, які прайшоў у 2005 годзе на базе Магілёўскай абласной псіхіятрычнай бальніцы. Семінар датычыўся тэмы «Паўнавартаснае жыццё — супрацьпраўе нацыстаў у адносінах да інвалідаў з псіхічнымі захворваннямі і сучаснае прававое становішча людзей з абмежаванымі магчымасцямі ў Германіі і Беларусі». Разглядаліся пытанні медыцынскай этыкі і правоў пацыентаў. Менавіта падчас семінара і прагучала ідэя стварэння памятнага знака ў Магілёве.

— На тэрыторыі нямецкай клінікі ў Хайдэльбергу ёсць помнік, прысвечаны ахвярам праекта Т4, — удакладняе Алена Лазарэнка. — Першыя спробы эўтаназіі праводзіліся на хворых менавіта нямецкіх псіхіятрычных клінік, а потым і на грамадзянах, прывезеных з акупаваных тэрыторый Савецкага Саюза. У памяць ахвяр зроблены помнік у выглядзе круга, на якім высечаны нямецкія і рускія імёны. Ініцыятыва немцаў са стварэннем помніка ў Магілёве была падтрымана Магілёўскім аблвыканкамам. З 2005 года з беларускага і нямецкага бакоў была праведзена вялікая работа па зборы і вывучэнні гістарычных падзей пра тыя падзеі. У рабоце ініцыятыўнай групы ўдзельнічалі людзі розных прафесій, вучоныя, студэнты, псіхолагі. Куратарам з нямецкага боку стаў Герыт Хаендорф. Немцы арганізавалі збор сродкаў, якія потым пайшлі на стварэнне помніка.

## Агульная памяць

Ідэя з памятным знакам была рэалізавана ў 2009 годзе. Праект помніка на тэрыторыі псіхіятрычнай бальніцы «У памяць аб загубленых душах» стаў вынікам шматгадовага супрацоўніцтва Магілёўскай абласной псіхіятрычнай бальніцы і грамадскай ініцыятывы нямецкага горада Карлсруэ, узначаленай доктарам Ульрыхам Лохманам. У конкурсе на найлепшы эскіз было прадстаўлена шмат работ, але аднагалосна перамог Аляксандр Мінькоў.

Памятны знак быў адкрыты 2 ліпеня на тэрыторыі абласной псіхіятрычнай бальніцы каля таго будынка, дзе знаходзілася душагубка. У мерапрыемстве прынялі ўдзел і прадстаўнікі Пасольства ФРГ у Беларусі, а таксама ўніверсітэцкай клінікі горада Хайдэльберга.

— Кожны раз, калі мы адзначаем даты, звязаныя з ваенным мінулым і ахвярамі Вялікай Айчыннай вайны, прыходзім сюды, каб яшчэ раз ушанаваць памяць нашых калег і пацыентаў, — кажа Алена Лазарэнка. — Дагэтуль жыву марай аднавіць той музей, які быў на тэрыторыі бальніцы. На жаль, вельмі мала экспанатаў. Самы каштоўны — кніга з кадравымі загадамі па бальніцы 1944 года. Але музей гэты патрэбны. Бальніца пачала функцыянаваць практычна адразу ж пасля вызвалення Магілёва — з ліпеня 1944 года. Спачатку прывялі ў парадак памяшканні і тэрыторыю, а ў жніўні тут знаходзіліся 54 хворых, працаваў адзін урач, дзевяць медсясцёр і шаснаццаць санітараў. У 2011 годзе ў мяне была магчымасць выступіць з дакладам пра гісторыю магілёўскай псіхіятрычнай бальніцы на адкрытай дыскусіі па ахвярах фашысцкага генацыду ў Германіі. Гэтая тэма наогул вельмі трагічная. Псіхічна хворыя людзі — самыя безабаронныя і адкрытыя. Відавочцы расказвалі, што, калі іх везлі на расстрэл пад выглядам эвакуацыі, яны бралі з сабой самае дарагое, што ў іх было, — хустачку, талерачку. Слухаць такое без слёз было немагчыма. Гэтыя людзі былі цалкам знясіленыя, худыя. Немцы, калі прыйшлі ў горад, пазбавілі пацыентаў псіхіятрычнай бальніцы прадуктаў. Страшна, калі чалавека ператвараюць у не патрэбны нікому баласт. І хочацца, каб гісторыя пра гэты перыяд не забывалася. Пошукі працягваюцца дагэтуль. Але інфармацыя часта вельмі супярэчлівая, недакладная. Прыходзіцца ўвесь час нешта перапрацоўваць, дапаўняць. Дачка Паліна, калі была школьніцай, дапамагала мне, удзельнічала са сваімі даследчымі работамі ў конкурсах, прэзентацыях. Цяпер яна вельмі запатрабаваны ўрач і часу займацца гісторыяй у яе не хапае. Але цікавасць праяўляюць школьнікі, навучэнцы медыцынскага каледжа. Так што памяць аб тых жахлівых падзеях у надзейных руках. Дарэчы, на помніку ёсць вельмі трапны надпіс: «Хто забывае сваё мінулае, той асуджаны на яго паўтор».

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**
**Фота аўтара**
**і з архіва Алены ЛАЗАРЭНКІ.**

*Праект створаны пры фінансавай падтрымцы ў адпаведнасці з Указам Прэзідэнта № 131 ад 31 сакавіка 2022 года.*

# НАЗАЎСЁДЫ — У НАШАЙ ПАМЯЦІ

## У Нацыянальным архіве прэзентавалі зборнік дакументаў «Хатынская трагедыя»




**У выданні, створаным супрацоўнікамі архіва, распавядаецца аб знішчэнні нацыстамі вёскі Хатынь Лагойскага раёна. Карціна таго страшнага дня, 22 сакавіка 1943 года, узноўлена максімальна дакладна і аб'ектыўна — дакументы не хлусяць. Прычым аб тым, што гэта быў акт генацыду ў дачыненні да мірных жыхароў, пацвярджаюць не толькі паказанні відавочцаў і дакументы Надзвычайнай дзяржаўнай камісіі, якая займалася выяўленнем і расследаваннем злачынстваў акупантаў і іх памагатых, але і сведчанні катаў, забойцаў хатынцаў.**



Акрамя таго, у зборніку можна даведацца, як ажыццяўляўся працэс увекавечання памяці жыхароў Хатыні. Як узводзіўся знакаміты на ўвесь свет мемарыяльны комплекс, хто быў у гэтым задзейнічаны, адлюстравана ў дакументах і ва ўспамінах аўтараў мемарыяла. Усе 195 дакументаў расказваюць аб хатынскай трагедыі і яе мемарыялізацыі. Большасць з іх захоўваецца ў Нацыянальным архіве Беларусі. Аднак увайшлі ў зборнік і дакументы з іншых архіваў, у тым ліку Расійскай Федэрацыі. Каштоўны матэрыял знайшоўся і ў перыядычным друку. Ілюстрацыйны матэрыял прадстаўлены фотаздымкамі сведак трагедыі, аўтараў мемарыяльнага комплексу.

### Дакументальны доказ злачынства

Падчас прэзентацыі зборніка дакументаў **дырэктар Нацыянальнага архіва Андрэй ДЗЕМЯНЮК** адзначыў сімвалічнасць таго, што ён выйшаў напярэдадні 80-годдзя хатынскай трагедыі. «Здавалася, што прайшло ўжо столькі часу і тэма гэта дастаткова вывучана, аднак дагэтуль існуюць розныя інтэрпрэтацыі, адбываюцца адкрытыя фальсіфікацыі тых падзей, — заўважыў ён. — Таму Нацыянальны архіў сумесна з супрацоўнікамі Інстытута гісторыі вырашылі яшчэ раз звярнуцца на гэтую праблему і прадставіць неабвержны дакументальны доказ аб зверствах нацыстаў і іх памагатых у спальванні вёсак, у прыватнасці Хатыні».

Гэтая лагойская вёска стала сімвалам знішчаных населеных пунктаў падчас Вялікай Айчыннай вайны. Аднак лёс Хатыні паўтарылі, па апошніх звестках, не менш за 216 паселішчаў. Усяго, па даных Генеральнай пракуратуры, у гады вайны поўнасцю і часткова было спалена звыш 10,5 тысячы сельскіх населеных пунктаў. Аднак гэта яшчэ не канчатковая лічба — расследаванне аб генацыдзе беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны і пасляваенны час працягваецца.

«Сёння, напэўна, няма чалавека, які б не чуў такога слова, як Хатынь, — перакананы **дырэктар Дэпартамента па архівах і справаводстве Алег ВОІНАЎ**. — Назва невялікага беларускага паселішча для ўсіх нас стала сімвалам трагедыі народа Беларусі падчас Вялікай Айчыннай вайны. Гэтая вайна якасна адрознівалася ад папярэдніх. Перш за ўсё тым, што ўслед за нямецка-фашысцкімі войскамі ішлі так званыя войскі СС, асноўнай задачай якіх было падаўленне любога супраціўлення і знішчэнне тых, хто не быў згодны з рэжымам, які спрабавалі ўстанавіць на нашай тэрыторыі. Нагодай для масавага знішчэння людзей была барацьба з рухам супраціўлення, з падпольшчыкамі і партызанамі. Бязлітаснасць у адносінах да мірнага насельніцтва захопнікі тлумачылі тым, што караюць толькі партызан і іх памагатых. Гітлераўцы лічылі, што масавыя пакаранні, знішчэнне гарадоў, вёсак дазволяць узяць пад кантроль сітуацыю, запалохаць беларусаў і не дапусціць супраціўлення на нашай зямлі».

Аднак, як вядома з гісторыі, у іх гэта не атрымалася. Беларускі народ — ад малога да вялікага — змагаўся з ворагам, не думаючы пра ўласнае жыццё, але ніколі не забываючы пра будучыню краіны, заўтрашні дзень сваёй нацыі.

**Акадэмік-сакратар, член-карэспандэнт Нацыянальнай акадэміі навук Аляксандр КАВАЛЕНЯ** падкрэсліў, што Хатынь стала сімвалам трагедыі і смутку беларускага народа, перамогай дабра над злом. Па яго словах, званы Хатыні «будзяць у нас неабходнасць памяці, каб здзяйсняць новае ў нашым жыцці, каб адстойваць праўду аб вайне».

Як звярнула ўвагу **намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі Палаты прадстаўнікоў Лілія АНАНІЧ**, можна дапускаць магчымасць інтэрпрэтацыі тых падзей, але нельга скажаць факты, асабліва калі гэта датычыцца нашай гістарычнай памяці аб Вялікай Айчыннай вайне, Вялікай Перамозе, падзеях — трагічных і гераічных. «Нашу гістарычную памяць хочуць адмяніць, і робіцца для гэтага ўсё: не толькі разбураюцца помнікі, але і прымаюцца міжнародныя рэзалюцыі, калі на Савецкі Саюз ускладаецца адказнасць за развязванне вайны», — канстатавала дэпутат.

Парламентарый нагадала, што ў Беларусі назапашаны вопыт мемарыяльнага заканадаўства (у маі 2021 года быў падпісаны Закон «Аб недапушчэнні рэабілітацыі нацызму», у студзені 2022 года — Закон «Аб генацыдзе беларускага народа»), які можа быць не толькі карысным, але і неабходным, для іншых краін. «Дзяржаў, якія так, як і мы, раздзяляюць і трагедыю Хатыні, і таго пакалення, хто вынес на сабе гэтую страшную вайну, шануе гэтую памяць, увекавечваючы яе ў велічных манументах і сціплых абелісках, — падкрэсліла Лілія Ананіч. — Да таго часу, пакуль мы будзем рабіць менавіта так, мы маем права называць сябе нашчадкамі пакалення пераможцаў, прадстаўнікамі народа Рэспублікі Беларусь і быць упэўненымі ў тым, што ніколі наша зямля не будзе ведаць падобных выпрабаванняў».

### Адказнасць перад судом гісторыі

**Вядучы навуковы супрацоўнік аддзела публікацый Нацыянальнага архіва Вячаслаў СЕЛЯМЕНЕЎ** адзначыў, што 15 гадоў мінула, як хатынская тэма ўвайшла ў дзейнасць Нацыянальнага архіва. «У апошнія гады наша навуковая супольнасць не праявіла цікавасць па гэтай праблеме, — заўважыў кіраўнік творчага калектыву зборніка дакументаў «Хатынская трагедыя». — Цяпер жа, калі гэтай тэмай занялася Генеральная пракуратура, разгарнулася маштабная работа. Аднак па-ранейшаму ў нас няма ніводнага навуковага даследавання па тэме спаленых беларускіх вёсак. Затое ёсць 11 зборнікаў дакументаў, у якіх разглядаецца хатынская праблема і стварэнне мемарыяла на месцы трагедыі. Прыступаючы да гэтай тэмы, на той момант мы атрымалі добрую магчымасць працаваць з крымінальнымі справамі асуджаных ваеннаслужачых 118-га батальёна і асобага батальёна СС Дзірлевангера. Сёння звярнуцца да гэтых дакументаў нельга: яны засакрэчаны».

Затое ёсць шэраг адпаведных зборнікаў матэрыялаў — архівістамі поўнасцю адноўлена карціна таго, што адбылося 22 сакавіка 1943 года ў Хатыні. Дакладна вядома, што ў знішчэнні Хатыні ўдзельнічалі два падраздзяленні: 118-ы ўкраінскі батальён ахоўнай паліцыі і асобы батальён СС Дзірлевангера. Адзінай «белай плямай» у гэтай крывавай гісторыі, па словах Вячаслава Селяменева, застаецца лёс камандзіра 118-га батальёна Кёрнера.

«Хатынь — праблема не толькі нашай памяці, — звярнуў увагу **навуковы супрацоўнік Цэнтра ваеннай гісторыі Беларусі Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Валерый НАДТАЧАЕЎ**. — Гэта яшчэ і пытанне размеркавання і захавання адказнасці аб асобах, якія здзейснілі злачынствы. Мы пра іх памятаем не таму, што імі ганарымся. Мы пра іх памятаем па той прычыне, што яны павінны быць пакараны. І нават праз гады, няхай гэта будзе і завочны прыгавор суда, не кажучы ўжо аб судзе нашай памяці. Забойцам хатынцаў няма ніякага даравання».

### Храм пад адкрытым небам

**Кіраўнік Творчай майстэрні архітэктара Леаніда Левіна Галіна ЛЕВІНА** назвала кнігі, выпушчаныя ў розны час Нацыянальным архівам па гісторыі Хатыні, залатым фондам мемарыялізацыі гісторыі Хатыні. І апошні зборнік — не выключэнне. «Як сама трагедыя ў Хатыні перавярнула адносіны да Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны, так і стварэнне мемарыяла паўплывала на тое, як пачалі ўспрымаць нашу краіну з пачатку 1970-х гадоў, — заўважыла архітэктар. — Хатынь паўплывала і на мастацтва (Нацыянальны мастацкі музей рыхтуе выставу тых работ, якія па матывах Хатынскай трагедыі стварылі мастакі 1970-х гадоў), і на літаратуру, кінематаграфію. У Леаніда Мендэлевіча пыталіся, ці з'яўляецца помнік у Хатыні савецкім. Бацька заўсёды казаў, што гэта беларускі помнік, бо ён мог узнікнуць толькі тут, на беларускай зямлі».

Падчас прэзентацыі зборніка дакументаў прысутнічаў **адзін з аўтараў мемарыяльнага комплексу «Хатынь», лаўрэат Ленінскай прэміі Юрый ГРАДАЎ**. Вядомы архітэктар згадаў, як адбывалася ўзвядзенне адной са святынь беларускага народа, сімвала ўсіх спаленых вёсак у нашай краіне. Ён распавёў, што вельмі эмацыянальны адбітак на творчую каманду наклала гісторыя знішчэння Хатыні. «Хатынь — гэта помнік-дакумент, — перакананы Юрый Градаў. — Мы дакументальна сродкамі мастацтва, архітэктуры, дызайну расказалі аб трагедыі, якая тут адбылася. Я называю Хатынь храмам пад адкрытым небам, дзе неба — гэта купал, навакольны лес — сцены, а 26 хат са званамі — гэта званіца».

Як справядліва заўважыў Юрый Градаў, Хатынь вытрымлівае выпрабаванні часам — яна сучасная і сёння. І з гэтым складана не пагадзіцца. Колькі раз ні прыязджаў бы на гэтае месца, якое стала незагойнай ранай для беларусаў, адчуваеш непадробныя эмоцыі. Пабываўшы нават у адной Хатыні, разумееш, што вайна — гэта страшна і недапушчальна. Ні пры якіх абставінах такое не павінна паўтарыцца на нашай зямлі.

**Вераніка КАНЮТА,**
**фота Нацыянальнага архіва.**

Меркаванне

# НЕ ДАЗВОЛІМ АДРАДЗІЦЬ ФАШЫЗМ

**Член Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі Наталля ТАРАСЕНКА:**



— 22 сакавіка — Дзень памяці ахвяр Хатынскай трагедыі. 80 гадоў таму невялікая вёсачка пад Лагойскам разам з усімі жыхарамі была цалкам знішчана нямецка-фашысцкімі акупантамі і іх памагатымі. Хатынь стала сімвалам усіх спаленых вёсак Беларусі, сімвалам болю і нязломнай стойкасці нашага народа, вечным праклёнам тым, хто нясе смерць чалавецтву. Мемарыяльны комплекс «Хатынь» сустракае сакавік 2023 года абноўленым. Праведзены маштабныя работы па мадэрнізацыі і рэстаўрацыі аб'ектаў, добраўпарадкаванні тэрыторыі. На плошчы тысячы квадратных метраў з'явіўся новы музей «Кожны трэці» — у памяць аб мільёнах беларусаў, жыццё якіх забрала Вялікая Айчынная вайна.

Паважлівыя адносіны беларусаў да гістарычнай памяці аб гераічным мінулым свайго народа і абавязак яе захавання замацаваны ў артыкуле 54 абноўленай Канстытуцыі. На жаль, чалавецтва дрэнна засвоіла ўрокі мінулага, калі апраўдвае і ўзводзіць у ранг нацыянальных герояў забойцаў і здраднікаў, адраджае ідэі нацызму і пакланяецца яго сімвалам. Вось толькі адзін прыклад. На працягу ўжо 30 гадоў 16 сакавіка ў сталіцы Латвіі — Рызе — праходзіць шэсце легіянераў СС і іх прыхільнікаў. Па вуліцах Рыгі з вывешанымі на паказ знакамі нямецкай свастыкі ідуць, ганарліва ўскінуўшы галовы, нашчадкі тых, хто атрымліваў узнагароды за забойства мірных грамадзян, правядзенне карных аперацый, якія былі прызнаныя Нюрнбергскім трыбуналам ваеннымі злачынцамі. Арганізатар дадзенага мерапрыемства — нацыяналістычная арганізацыя «Ястрабы Даўгавы», члены якой падтрымліваюць латышскіх легіянераў СС. Сёння яны аб'ядноўваюць вакол сябе змагароў за свабоду і незалежнасць Латвіі. На тэрыторыі акупаванай Латвіі з ліпеня 1941 года быў створаны 41 паліцэйскі батальён. Гэтыя падонкі пакінулі свой крывавы след у Расіі, Беларусі, Польшчы. Ядром латышскіх нацыяналістычных фарміраванняў СС сталі нацыяналісты, якія прысягалі на вернасць Гітлеру, абяцаючы неабмежаваную паслухмянасць фюрэру. Менавіта яны сталі стрыжнем 15-й і 19-й грэнадзёрскіх дывізій СС, якія ўдзельнічалі ў карных аперацыях супраць мірных жыхароў. Паводле архіўных звестак, толькі за люты і сакавік 1944 года латышскія легіянеры СС знішчылі ў Віцебскай вобласці 138 вёсак, забілі 17 тысяч чалавек. Яшчэ каля 13 тысяч беларусаў было сагнана ў Германію.

Колькі б дзесяцігоддзяў ні прайшло, немагчыма выкрасліць з народнай памяці старонкі Вялікай Айчыннай вайны. Гістарычная місія беларусаў — захаваць праўду пра вайну, аб вялікім подзвігу савецкага народа, вялікіх ахвярах, цаной якіх дасягнута Перамога. «Пакуль у краінах, якія савецкія войскі вызвалялі ад фашызму, разбураюць магілы нашых дзядоў і прадзедаў — тут, на беларускай зямлі, мы будзем узнімаць архівы і аднаўляць гісторыю кожнага воіна, кожнай нявіннай ахвяры. Гэта вельмі балючыя для нас успаміны. Да гэтага часу яны былі нашай ціхай журботнай памяццю. Цяпер стануць набатам... каб увесь свет зразумеў, што будзе, калі сучасны нацызм перарасце ў фашызм». Гэтыя словы нашага Прэзідэнта Аляксандра Лукашэнкі яшчэ раз падкрэсліваюць, наколькі важна нам захаваць той падмурак, на якім будуецца незалежнасць і суверэнітэт беларускай дзяржавы, які аб'ядноўвае ўвесь беларускі народ. А ігнараванне народамі калектыўнага Захаду праяў нацысцкай ідэалогіі ў жыцці іх краін у канчатковым выніку павернецца супраць іх саміх.

**Запісала Нэлі ЗІГУЛЯ.**

**Калектыў Выдавецкага дома «Звязда» глыбока смуткуе з прычыны заўчаснай смерці вядучага стылістычнага рэдактара Вольгі Генадзьеўны ГАНЧАРОВАЙ і выказвае шчырыя спачуванні родным і блізкім нябожчыцы.**

# «А ШТО РАБІЦЬ МНЕ?»

## БАЛЬНІЦЫ, РЭАБІЛІТАЦЫІ, ЗНОЎ БАЛЬНІЦЫ

Шэсць высокіх прыступак для чалавека ў інваліднай калясцы становяцца непераадольнай перашкодай, а яшчэ тут вузкія для каляскі дзверы... Да нядаўняга часу Ірына Уладзіміраўна магла пакрысе перастаўляць ногі з кіёчкам, цяпер зусім перасела ў каляску. «Я звярталася ў райвыканкам, у розныя вышэйшыя органы ўлады, у пракуратуру, — піша яна, — і адусюль атрымліваю падобныя адно на адно паведамленні аб немагчымасці вырашыць пытанне з устаноўкай пад'ёмніка ў доме. У лепшым выпадку адказваюць, што пытанне ўзята на кантроль. А што рабіць мне?! Я ж прывязаная да гэтага свайго пакоя, нікуды не магу выйсці, свету не бачу».

І вось прыязджаю ў Івацэвічы, знаходжу дом, які звонку нагадвае інтэрнат, званю ў кватэру. З-за дзвярэй чую, як гаспадыня пад'язджае на калясцы, адчыняе дзверы. Потым мы доўга гутарым. Ірына Уладзіміраўна падрабязна расказвала сваю жыццёвую гісторыю. Паводле яе слоў, яна была здаровая да 14 гадоў, вось толькі зрок быў дрэнны, таму некаторы час вучылася ў спецыялізаванай школе-інтэрнаце для дзяцей з аслабленым зрокам у Жабінцы. У 14 гадоў упершыню сур'ёзна захварэла. Потым былі аперацыі, доўгія курсы лячэння, доўгія гады рэабілітацый. Бальніцы ў сталіцы, абласным цэнтры, Баранавічах, Івацэвічах — калі скласці час знаходжання ў лячэбных установах, атрымаюцца гады. Пасля адной з аперацый восем гадоў не хадзіла і амаль не гаварыла, даглядала яе маці — Любоў Міхайлаўна. Дарэчы, нарадзілася і вырасла Ірына ў вёсцы Быцень, жыла там у бацькоўскім доме з невялікімі перапынкамі аж да мінулага года.

## ІНТЭРНАТ, А ПОТЫМ КВАТЭРА

У леташнім маі маці памерла. Адносіны з іншымі сваякамі (ёсць яшчэ брат і сястра) у Ірыны, паводле яе слоў, не склаліся, таму яна даўно разглядала магчымасць атрымаць жыллё ў райцэнтры. Яшчэ ў снежні 2011 года запісалася на прыём да старшыні Івацэвіцкага райвыканкама. На выніках таго прыёму яе зарэгістравалі ў адным з інтэрнатаў горада, які размешчаны па вуліцы Леніна. Тады ж яна была прынята на ўлік грамадзян, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў.

Як вынікае з пісьма Івацэвіцкага райвыканкама ў Камітэт па працы, занятасці і сацыяльнай абароны Брэсцкага аблвыканкама: «2 лютага 2022 года Падліпскай І. В. дадзена арэнднае жылое памяшканне па вуліцы 60 гадоў Кастрычніка, 11. Заключаны дагавор найму арэнднага жылля 4 лютага 2022 года, і грамадзянка заселена ў кватэру. Рашэннем Івацэвіцкага райвыканкама ад 24 сакавіка 2022 года названая кватэра

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*



Шэсць прыступак.

ўключана ў склад жылых памяшканняў сацыяльнага карыстання дзяржаўнага жыллёвага фонду. З грамадзянкай Падліпскай заключаны дагавор найму жылога памяшкання сацыяльнага карыстання».

Далей у пісьме ўказана, што Івацэвіцкай ЖКГ часткова выкананы работы па стварэнні безбар'ернага асяроддзя для інваліда-калясачніка: устаноўлены поручні на лесвічным маршы, прыступкі пафарбаваны ў кантрасны колер, абсталявана месца для захоўвання інваліднай каляскі. І нават у парадку выключэння на падставе рашэння раённага выканаўчага камітэта паслугі сацыяльнага работніка ёй аказваюцца бясплатна. А сацыяльны работнік прыходзіць да інваліда пяць разоў на тыдзень.

Усё гэта так, але пакуль Ірына Уладзіміраўна магла хоць са староннняй дапамогай пераадолець гэтыя прыступкі, можна было трываць. А цяпер на гэтае яе «А што рабіць мне?» — ні ў кога няма адказу.

Ёй жа толькі 51 год. Як і ўсякая жанчына, яна хацела б наведаць цырульню, зрабіць сякія-такія пакупкі не праз пасрэдніцтва яе памочніцы, сацыяльнага работніка Людмілы, а каб самой паглядзець, патрымаць у руках рэч. Зноў жа лішні раз трэба наведаць паліклініку, бо цяпер гэта яе другі дом... Ды і, што тут казаць, чалавек прывязаны да чатырох сцен кватэры, а яна па характары, як відаць, актыўная...

## ЦАНА ПЫТАННЯ І МАГЧЫМАСЦІ БЮДЖЭТУ

**Начальнік упраўлення па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Івацэвіцкага райвыканкама Аляксандр ВЕЛІКАСЕЛЕЦ** дастае адмысловую папку з дакументамі і паказвае:

— Вось заключэнне спецыялістаў «Івацэвічыбудпраект», якія выязджалі на месца і даследавалі становішча. Яны паведамляюць, што для забеспячэння перасоўвання з вуліцы ў агульны калідор неабходна выканаць перабудову з васьмі пунктаў: правесці дэмантаж уваходных дзвярэй у пад'езд, зрабіць дэмантаж перагародкі тамбура з дзвярыма, уладкаваць тамбур з дзвярыма звонку, выраўняць узровень падлогі тамбура і падлогі лесвічнай клеткі цэментна-пясчанай сцяжкай таўшчынёй каля 100 міліметраў, выканаць устройства падлогі з керамічнай пліткі ў тамбуры і на лесвічнай пляцоўцы, купіць і зманціраваць нахільны пад'ёмнік, папярэдне падвёўшы сетку электразабеспячэння. Пасля гэтага застанецца замяніць дзверы і пашырыць праём з лесвічнай клеткі на агульны калідор, а яшчэ пашырыць праём і ўстанавіць новыя дзверы насупраць уваходу з лесвічнай клеткі. Усё гэта, паводле папярэдніх прыблізных разлікаў, каштуе больш за 86 тысяч рублёў. Як той казаў, цана пытання, але грошай на яго вырашэнне няма.

Аляксандр Фёдаравіч паказвае яшчэ цэлую праграму мерапрыемстваў па раёне пад назвай «Даступнае асяроддзе жыццядзейнасці інвалідаў і фізічна аслабленых асоб» у рамках Дзяржаўнай праграмы «Сацыяльная абарона» на 2021—2025 гады. Элементаў безбар'ернага асяроддзя чакаюць гарадская бібліятэка, Цэнтральная гарадская бальніца, Касаўская гарадская бальніца, Целяханская гарадская бальніца, Святаволькая бальніца сацыяльнага догляду. Вядома, у першую чаргу трэба зрабіць даступнымі для ўсіх грамадзян установы аховы здароўя. І ў Доме культуры, скажам, павінен быць санвузел для інвалідаў усіх катэгорый, і бібліятэку трэба зрабіць такой, каб яе маглі наведаць усе незалежна ад стану здароўя.

Педыятрычнае аддзяленне раённай паліклінікі чакае санвузла з неабходнай інфраструктурай, стаматалагічнае аддзяленне мае патрэбу ў пад'ёмніку, а таксама ў пандусе і поручнях. Спіс гэты вялікі, на яго рэалізацыю грошай трэба шмат. Але, скажам, на 2023 год па Івацэвіцкім раёне было запланавана стварэнне даступнага асяроддзя на шасці аб'ектах, грошай было выдзелена толькі на чатыры з іх. А на два іншыя, у іх ліку раённая бальніца і гарадскі Дом культуры, патрабуецца 140 тысяч рублёў, і, як вынікае з пісьма райвыканкама, «прафінансаваць гэтыя мерапрыемствы з раённага бюджэту магчымасці няма».

## ВЫЙСЦЕ — ПАД'ЁМНІК

Які да ўсяго гэтага клопат інваліду Ірыне Падліпскай? Хутчэй за ўсё ніякага, але ж грошай на яшчэ адну добрую справу ў раённым бюджэце няма. Відавочна, што зманціраваць і ўстанавіць пад'ёмнік у гэтым зусім старым доме, які раней называлі маласямейкай, у цяперашняй сітуацыі сапраўды нерэальна.

Але ж нейкае выйсце павінна быць, тым больш што Ірына Уладзіміраўна не адзіны інвалід-калясачнік у Івацэвічах, які з-за асяроддзя абмежаваны ў руху, камунікацыях, якасці жыцця. Аўтар гэтых радкоў пацікавілася, як вырашаецца пытанне, напрыклад, у абласным цэнтры. І высветліла, што на базе цэнтраў сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва ёсць чатыры перасоўныя пад'ёмнікі: адзін — у Ленінскім раёне, тры — у Маскоўскім. Напрыклад, у Ленінскім раёне пад'ёмнік дастаўляюць інваліду па папярэдняй заяўцы, калі чалавеку трэба пакінуць сцены кватэры і наведаць нейкую ўстанову. У Маскоўскім раёне раней таксама так рабілі, а калі ўбачылі, што заяўку пакідаюць адны і тыя ж людзі, перадалі па дагаворы ў бязвыплатнае карыстанне на вызначаны тэрмін кожны з пад'ёмнікаў.

Як паведаміла **намеснік начальніка ўпраўлення па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Брэсцкага гарвыканкама Іна СТУПНІКАВА,** зараз вырашаецца пытанне аб набыцці яшчэ двух пад'ёмнікаў за сродкі гарадскога бюджэту па праграме «Сацыяльная абарона» на 2021—2025 гады.

Відаць, наспеў час вырашаць пытанне аб набыцці хоць бы аднаго такога пад'ёмніка ў кожным раёне, шукаць крыніцы фінансавання.

***

Пры падрыхтоўцы гэтага матэрыялу давялося пачуць меркаванні многіх людзей. Відаць, маюць рацыю і тыя, хто лічыць, што Ірына Падліпская многага дабіваецца, таму што мае прабіўны характар. Яна пастаянна піша, звяртаецца. Ёй дапамагаюць. За апошні год, напрыклад, ёй аказвалі дапамогу на харчаванне і прадметы гігіены, летась выдзелілі 762 рублі на набыццё душавога паддона ў ванны пакой. Ёсць людзі, якія сядзяць у сваіх дамах і кватэрах, гадамі не выходзяць на вуліцу і нічога не просяць. Але ж ці правільна гэта?

Каб была здаровая, Ірына працавала б на свой дабрабыт і нікога не турбавала б. Мы ўсе павінны ім, інвалідам, хоць бы таму, што маем магчымасць хадзіць, працаваць, што лёс выбраў іх, а не нас, бо ад таго, каб сесці ў інвалідную каляску, не застрахаваны ніхто ў гэтым свеце. Безбар'ернае асяроддзе, як вядома, — прыкмета цывілізаванасці грамадства, яго сталасці, культуры. Разумення гэтых простых рэчаў, на жаль, бракавала папярэднікам, таму і будавалі так, нібы ніякіх інвалідаў наогул няма. І да гэтай пары расплачваемся за тыя падыходы. Але ж нельга пакідаць людзей вось так сам-насам са сваёй каляскай і адзінотай. Можа, трэба ўзнімаць дэпутатаў усіх узроўняў, грамадскія структуры (чым не нагода вызначыцца новым партыям, рухам?), знаходзіць спонсараў для добрай справы. Ну хоць бы адзін пад'ёмнік на раён у XXI стагоддзі ў распараджэнні сацыяльных службаў мусіць быць!

**Святлана ЯСКЕВІЧ,**
*Івацэвіцкі раён.*

---

Будзь у курсе!

# У водпуск з чыгункай

**На летні перыяд прызначаны цягнік Мінск/Гомель — Анапа**

**У першы рэйс цягнік № 490/489 Мінск/Гомель — Анапа адправіцца з Мінска 5 мая ў 10.58 (з Гомеля — у 15.40) і прыбудзе ў Анапу 7 мая ў 10.37. З Анапы цягнік адправіцца ў гэты ж дзень 7 мая ў 21.33 і прыбудзе ў Гомель 9 мая ў 14.08, а ў сталіцу Беларусі — у 18.59. Далей ён будзе курсіраваць праз дзень па няцотных чыслах месяца з Мінска да 27 верасня, з Анапы — да 29 верасня. Пра гэта інфармуе прэс-цэнтр магістралі.**

Трэба адзначыць, што акрамя павелічэння частаты курсіравання цягніка, таксама сёлета скарочаны час знаходжання яго ў дарозе больш чым на дзве гадзіны ў абодвух напрамках.

Акрамя таго, для пасажыраў Беларускай чыгункі арганізавана магчымасць круглагадовага праезду на курорты Краснадарскага краю, такія як Адлер, Сочы, Туапсэ, цягніком № 302/301 Мінск/Гомель — Адлер фарміравання БЧ адпраўленнем з Мінска і Адлера па цотных чыслах месяца.

Больш падрабязную інфармацыю аб графіку руху цягнікоў, кошце і правілах праезду можна атрымаць на сайце pass.rw.by, з дапамогай афіцыйнага мабільнага дадатку «БЧ. Мой цягнік» і па тэлефоне Кантакт-цэнтра Беларускай чыгункі 105 (падтрымка пасажыраў, якія знаходзяцца за межамі Рэспублікі Беларусь, па тэлефоне +375 222 39 25 47).

---

Ну і ну!

## З нафтавым «бізнесам» не склалася...

**62-гадовы жыхар Шаркаўшчыны пазбавіўся буйной сумы грошай з-за махляроў. Мужчына ў месенджары трапіў на аб'яву аб дадатковым заробку і адгукнуўся на яе.**

З ім звязаліся і сталі абяцаць вялікі прыбытак ад удзелу ў інвестыцыйным праекце. Пенсіянеру распавялі, што з гэтага часу ён укладвае свае грошы ў нафтавы бізнес. Што было далей, паведамляе аддзяленне інфармацыі і грамадскіх сувязяў УУС Віцебскага аблвыканкама.

Для таго каб абароты былі большымі, трэба было перадаваць сваім куратарам грошы. Іх у пацярпелага не было. Тады ён накіраваўся ў банкі для ўзяцця крэдытаў. Усяго мужчына аформіў дзевяць пазык на агульную суму 40 тысяч рублёў.

Уся наяўнасць была перададзена зламыснікам. Тыя абяцалі неўзабаве вярнуць нібы заробленыя на інвестыцыях некалькі дзясяткаў тысяч долараў. Але грошы так і не паступілі на рахунак пенсіянера, а неўзабаве спынілася і сувязь з бізнес-настаўнікамі. Толькі пасля таго жыхар райцэнтра звярнуўся па дапамогу да праваахоўнікаў. Шаркаўшчынскім РАУС вядзецца праверка.

## Хацела зарабіць грошай...

**За лжывы данос — крымінальная справа**

**У аператыўна-дзяжурную службу Крупскага РАУС паступіла тэлефанаванне ад 31-гадовай мясцовай жыхаркі. Жанчына распавяла, што яе знаёмы па даверанасці павінен быў прыгнаць з-за мяжы аўтамабіль у асабістае карыстанне. Па словах заяўніцы, яна перадала яму 10 тысяч долараў, але хлопец на сувязь так і не выйшаў.**

Жанчына папрасіла знайсці мужчыну з яе грашыма і нават напісала заяву. Дарэчы, заяўніца была папярэджана праваахоўнікамі аб крымінальнай адказнасці за заведама лжывы данос.

Як паведамляе Крупскі РАУС, праз некалькі гадзін жанчына зноў патэлефанавала ў міліцыю і паведаміла, што знаёмы выйшаў на сувязь і гатовы на наступны дзень прыгнаць аўто.

У ходзе разбору аператыўнікі ўстанавілі грамадзяніна, якому нібыта была перададзена буйная сума. Мужчына растлумачыў, што ніякіх грошай не атрымліваў, а жанчыну і зусім не ведае.

Заяўніца прызналася, што гісторыю гэтую прыдумала — хацела зарабіць грошай. У выніку за загадзя лжывы данос была заведзена крымінальная справа. Санкцыя артыкула прадугледжвае абмежаванне свабоды на тэрмін да двух гадоў.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**



Цэнтральная прахадная Ганцавіцкага завода БПД.

# НЕПАЎТОРНАЕ АБЛІЧЧА

## Яно нараджаецца ў цэхах Ганцавіцкага завода БПД

**ПАНЭЛЬНАЕ домабудаванне ў нашы дні — гэта не тыпавыя шэрыя «прамавугольнікі», аднолькавыя што ў Мінску, што ў Брэсце. Тэхналогіі крочаць наперад, і сёння крытэрый прафесіяналізму ў будаўніцтве — не толькі хуткасць узвядзення і камфорт жыхароў, але і прыгажосць і эстэтыка дома. Пашыраецца разнастайнасць праекціровачных рашэнняў жылых дамоў і будынкаў агульнага карыстання. Між тым надзейнасць і якасць дома залежаць ад тых «дэталяў», з якіх ён будуецца, — гэта значыць, у першую чаргу ад якасці панэляў. Ганцавіцкі завод буйнапанэльнага домабудавання КУП «Брэстжылбуд» ідзе у нагу з часам, спалучаючы паўвекавыя традыцыі якасці і сучасныя тэхналогіі.**



Дырэктар завода Шаген МАЎСІСЯН.

Завод буйнапанэльнага домабудавання (БПД) — тая вытворчасць, якая робіць, бадай, найважнейшы ўнёсак у эканамічны дабрабыт Ганцавіцкага раёна. «Нарадзіўшыся» ў далёкім 1971 годзе, прадпрыемства прайшло доўгі і няпросты шлях. Завод з'явіўся на базе палігона жалезабетонных вырабаў, які выпускаў прадукцыю для меліярацыі. У 2000-х апынуўся на мяжы банкруцтва. Пераадолець крызіс дазволіла мадэрнізацыя вытворчасці, якая зрабіла магчымым засваенне выпуску жалезабетонных канструкцый «Шырокі крок». У 2013 годзе завод увайшоў у структуру КУП «Брэстжылбуд», і гэта стала пачаткам яго новай гісторыі. Сёння асноўны від дзейнасці Ганцавіцкага завода БПД — вытворчасць зборных жалезабетонных і бетонных канструкцый і вырабаў, а таксама гатовага бетону. З панэляў, якія сышлі з яго вытворчых ліній, будуюцца сучасныя жылыя комплексы, якія становяцца ўпрыгожваннем населеных пунктаў па ўсёй Брэсцкай вобласці, а таксама па вобласці сталічнай. На 2023 год запланавана стапрацэнтная загрузка магутнасцяў прадпрыемства — 35 000 м³ жалезабетону (а гэта 19 жылых дамоў, якія «вырастуць» дзякуючы ганцавіцкай прадукцыі).

— Для вытворчасці мы выкарыстоўваем сыравіну, набытую толькі на ўнутраным рынку краіны, — няма неабходнасці ў імпартных пастаўках сыравіны, — падкрэслівае **дырэктар Ганцавіцкага завода БПД КУП «Брэстжылбуд» Шаген МАЎСІСЯН.**

А вось гатовая прадукцыя завода мае сур'ёзны экспартны патэнцыял. Да нядаўняга часу дарожныя пліты, якія сышлі з яго канвеера, актыўна пастаўляліся ў Прыбалтыку, сёння разглядаюцца варыянты паставак у Расійскую Федэрацыю. Прадукцыя Ганцавіцкага завода БПД запатрабавана і на ўнутраным рынку. І гэта вынік прымянення прадпрыемствам перадавых тэхналогій, якія дазваляюць прапаноўваць эфектыўныя рашэнні для будаўніцтва. Мадэрнізацыя дае магчымасць рэалізаваць нават самыя складаныя задачы, хутка і якасна выпрабляючы сучасныя будаўнічыя панэлі пад любыя запыты заказчыкаў.



Брыгадзір чацвёртага пралёту Аляксандр ІЛЬЮШЭНКА абмяркоўвае працоўны план з галоўным інжынерам Дзмітрыем МАЛАХАВЫМ.



Фармоўшчык 4 разраду Раман МЕЛЕХАВЕЦ у пары са стажорам Аляксандрам ДЫДЫШКАМ дастаюць панэлі з касеты № 8 фармовачнага ўчастка.

## Набліжаючы будучыню

Літаральна днямі на Ганцавіцкім заводзе БПД пачалі працаваць дзве новыя стэндавыя лініі. Працэс мадэрнізацыі быў распачаты ў 2022 годзе і завершаны ў кароткія тэрміны. Мэтай было не столькі нарошчванне магутнасцяў, колькі магчымасць павялічыць наменклатуру і выпускаць яшчэ больш якасную і сучасную прадукцыю. Характэрна, што мадэрнізацыю свайго філіяла ў Ганцавічах КУП «Брэстжылбуд» практычна цалкам правяло за кошт уласных сродкаў (часткова былі выкарыстаны таксама крэдытныя рэсурсы, выдзеленыя Брэсцкім аблвыканкамам).

— Асноўная мэта замены абсталявання 4-га пралёту — павелічэнне прадукцыйнасці, павышэнне якасці жалезабетонных вырабаў з аднačасовым скарачэннем матэрыяльных выдаткаў на іх вытворчасць, — адзначыў галоўны **інжынер Ганцавіцкага завода БПД КУП «Брэстжылбуд» Дзмітрый МАЛАХАЎ.** — А другая мэта — стаць больш гнуткімі для забеспячэння патрабаванняў заказчыка.

Сёння нікому не прыйдзе ў галаву разважаць пра адсутнасць індывідуальнасці гарадской забудовы: наадварот — у праектаванні і будаўніцтве мноства тэндэнцыя ўзвядзення дамоў, не падобных адзін на другі, падкрэсліў спецыяліст. А значыць, патрабаванні да галіны ўзраслі: сучасныя тэхналогіі змяняюць панэльнае домабудаванне.

— Новыя лініі дазваляюць выраблять панэлі любой канфігурацыі, прычым пераналаджваецца абсталяванне вельмі хутка, — кажа галоўны інжынер. — Змену наменклатуры вырабаў мы можам праводзіць штодня. Гэта галоўная вартасць новых ліній: мы сышлі ад аднатыпнасці. Акрамя таго, новае абсталяванне дазваляе паменшыць спажыванне энергарэсурсаў, павялічыць прадукцыйнасць (да 1000—1400 м³), скараціць ручную працу, павысіць якасць вырабаў і знізіць выдаткі на іх давадку.

Стаўка на якасць і сучасныя тэхналогіі — у цэлым крэда прадпрыемства, менавіта гэтая пазіцыя дазваляе яму заставацца на плаву. Так, у 2010-м тут асвоілі выпуск жалезабетонных вырабаў для будаўніцтва дамоў па наватарскай схеме «Шырокі крок». І гэта дало заводу магчымасць пераламаць крызісную сітуацыю і выйсці на шлях поспеху. Тэхналогія дазволіла ўзводзіць жылыя дамы палепшанай планіроўкі, з самымі рознымі сучаснымі планіровачнымі рашэннямі кватэр.

Сёння прадпрыемства не спыняе пошук новых тэхналагічных рашэнняў. Разам з выпускам прадукцыі (усе магутнасці завода загружаныя нават зімой, калі ў будаўнічай галіне — «не сезон») сумесна з навукоўцамі стварае доследныя ўзоры новых відаў панэляў. І гэта — залог запатрабаванасці прадукцыі прадпрыемства ў перспектыве.


## Извещение о проведении **11 апреля 2023 года** торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДСТ № 5»

| Предмет торгов (сведения о продаваемом имуществе)* |
|---|
| «Нефтепродукт – обводненное (с примесями) сырьё для производства мазута (гудрона)» в количестве 2 000 тонн (ориентировочно), содержащийся в битумохранилище, расположенном по адресу: Минская область, Дзержинский район, г. Фаниполь, АБЗ «Фаниполь» |
| Начальная цена: 400 000,00 бел. руб. без учета НДС |
| Сумма задатка: 40 000,00 бел. руб. |

** Покупатель обязуется своими силами, средствами и за свой счет произвести вскрытие битумохранилища, выемку нефтепродукта (продаваемого имущества) с полной зачисткой всего содержимого битумохранилища, включая утилизацию отходов: загрязненного песка, грунта и т.п., с предоставлением разрешительных документов Министерства природных ресурсов и охраны окружающей среды Республики Беларусь, а также вывоз сырья с территории производственной базы продавца имущества. Окончательное количество продаваемого имущества определяется по мере выборки нефтепродукта с учетом его контрольного взвешивания.*

**Продавец имущества:** ОАО «ДСТ № 5», г.Минск, ул. Лукьяновича, 4-253.

**Организатор торгов:** государственное предприятие «МГЦН», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, к. 10.

**Условие торгов:** победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДСТ № 5», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

*Задаток перечисляется в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе, на расчетный счет № BY15 BLBB 3012 0190 3985 8300 1001 в ЦБУ № 527 ОАО «Белинвестбанк», г. Минск, БИК BLBBBY2X, кодификатор назначения платежа – 40901, получатель – государственное предприятие «МГЦН», УНП 190398583.*

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и не включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае, если торги признаны несостоявшимися в силу того что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежного документа о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи. По согласованию с продавцом возможна рассрочка платежа.

Торги проводятся **11 апреля 2023 года в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 27.03.2023 по 07.04.2023 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К.Маркса, 39, каб. 6. По вопросу осмотра объекта следует обращаться по телефону: (017) 388-43-21.

**Телефоны для справок:**
**(017) 365-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»);**
**(017) 388-43-21, (029) 179-23-02 (ОАО «ДСТ № 5»).**

# ГАРАДСКОЙ ЗАБУДОВЫ



## Вытворчасць — гэта людзі

— Галоўнае сёння — даць чалавеку магчымасць зарабляць і ствараць належныя ўмовы працы. Тады ў прадпрыемства будзе поспех, а ў яго работнікаў — дастатак, — перакананы **дырэктар Ганцавіцкага завода БПД КУП «Брэстжылбуд» Шаген МАЎСІСЯН.** — У нас па прадпрыемстве сярэдні заробак сёння 1320 рублёў: мабыць, адзін з самых высокіх у нашым раёне. І, галоўнае, тыя, хто хоча працаваць, сапраўды маюць магчымасць зарабляць вышэй за сярэдні ўзровень. Заўважу, што і бытавыя ўмовы мы імкнёмся забяспечваць людзям належныя: у месцах прыёму ежы ёсць і мікрахвалеўкі, і халадзільнікі, і электрачайнікі. Калектыўны дагавор прадугледжвае выплаты да агульных і індывідуальных свят і важных падзей. Таму мы не адчуваем дэфіцыту ў кваліфікаваных кадрах, а працоўныя дынастыі на нашым прадпрыемстве — з'ява распаўсюджаная.

Рашэнне стаць будаўніком Шаген Ванікавіч прыняў у 15 гадоў. У Ганцавічы маладым, тады яшчэ ваенны будаўнік прыехаў у 1988 годзе. У 1992-м дэмабілізаваўся і пачаў работу ў ПМК 14. Там і адпрацаваў 28 гадоў: прайшоў шлях ад майстра да галоўнага інжынера. А ў 2019 годзе ўзначаліў Ганцавіцкі завод буйнапанэльнага домабудавання.

— Давялося вучыцца, многае адкрываць для сябе, — кажа кіраўнік. — Вытворчасць патрабуе і гаспадарлівасці, і часам творчага падыходу да тэхналагічных пытанняў. Хачу сказаць «дзякуй» усяму нашаму працоўнаму калектыву — за маральную падтрымку і добрасумленную працу.



Зваршчыцы арматурных сетак і каркасаў Жанна МЕЛЕХАВЕЦ і Таццяна ЗАНЬКО ў арматурным цэху.

Сёння на прадпрыемстве 192 супрацоўнікі. Прычым 51 чалавек з гэтага ліку — жанчыны. Ці толькі ўзровень зарплаты ўтрымлівае прадстаўніц прыгожага полу на гэтай «мужчынскай» працы?

— Я на заводзе ўжо 6 гадоў, — распавядае **зваршчык арматурных канструкцый Жанна МЕЛЕХАВЕЦ.** — Прызнаюся, спачатку мяне проста прыцягнуў узровень заробку. Але потым я ўсвядоміла, што, якой бы цяжкай і «нежаночай» ні была гэтая праца, мне падабаецца працаваць з металам. Вядома, часам бывае няпроста: патрэбна фізічная сіла, бо мы працуем нароўні з мужчынамі. Бачыце, у арматурным цэху нас, жанчын, толькі двое, — не без гонару дадае суразмоўніца. — Я і **Таццяна ЗАНЬКО.**

Жанна ўспамінае, што спачатку шмат чаму прыйшлося вучыцца: бо па адукацыі яна парыкмахер і раней да падобнай вытворчасці дачынення не мела. Але сёння яна ўжо профі.

— Кожны раз іду на работу з радасцю і задавальненнем, — прызнаецца жанчына.

Новую лінію з дарагім сучасным абсталяваннем кіраўніцтва прадпрыемства даверыла **брыгадзіру Аляксандру ІЛЬЮШЭНКУ.**

— Як працуецца? Нармальна. Усе працэсы аўтаматызаваныя, вытворчасць чыстая, акуратная, за прадукцыю не сорамна, — кажа ён. — А ў цэлым працоўнае месца побач з домам, працы хапае: магутнасці загружаныя і летам, і зімой. Зарплата выплачваецца рэгулярна, на яе ўзровень не скардзімся, — пералічвае плюсы суразмоўца.

Ён дадае, што яшчэ адзін велізарны плюс працы на Ганцавіцкім заводзе БПД — прафесійны і дружны калектыў.

— За апошнія гады адсеяліся тыя, хто парушаў працоўную дысцыпліну, засталіся толькі добрасумленныя, сур'ёзныя прафесіяналы сваёй справы, — падкрэсліў брыгадзір.

## Працоўныя дынастыі

Працоўныя дынастыі на Ганцавіцкім заводзе БПД — не рэдкасць. **Юрыя ЧАРНЫШОВА** на заводзе называюць найлепшым **брыгадзірам зваршчыкаў**, яго партрэт — на дошцы гонару галаўнога прадпрыемства ў Брэсце.

— Чаму ён найлепшы? Ды таму, што найлепшы, — кажа пра яго **галоўны інжынер Дзмітрый МАЛАХАЎ.** — У яго падначаленні 30 чалавек, брыгада працуе хутка, выконвае ў сціслыя тэрміны дадзены план, вырабляе якасную прадукцыю.



Прадстаўнікі працоўнай дынастыі, электрагазазваршчыкі Юрый ЧАРНЫШОЎ і Ілья ЧАРНЫШОЎ вараць каркасы для залівання панэляў.



Кладаўшчык Святлана САЙКО разам з сынам, майстрам фармовачнага ўчастка Дзмітрыем САЙКО на фоне склада гатовай прадукцыі.

Юрый працуе на родным прадпрыемстве ўжо 32 гады. Не так даўно ў яго цэх прыйшло і новае пакаленне сям'і — сын і пляменнік. Сын Ілья атрымаў эканамічную адукацыю. Але працаваць прыйшоў па слядах бацькі — зваршчыкам.

— Мы, Чарнышовы, усе зваршчыкі, — тлумачыць Юрый. — Тут і бацька мой працаваў, і маці. Цяпер вось — сын і пляменнік. Мне здаецца, гэта вельмі добра, калі дзеці ідуць па слядах бацькоў. Гэта накладвае на іх пэўную адказнасць і за якасць працы, і за працоўную дысцыпліну.

Пра адказнасць кажа і **Святлана САЙКО, адна з найстарэйшых супрацоўніц Ганцавіцкага завода БПД.** Упершыню на гэтую вытворчасць Святлана Валянцінаўна прыйшла ў 1984 годзе. Працавала і майстрам у арматурным цэху, і ў аддзеле тэхнічнага кантролю. Цяпер, на пенсіі, засталася на родным заводзе кладаўшчыцай.

— А мой сын працуе майстрам фармовачнага ўчастка, — кажа суразмоўніца. — Працай ён задаволены. Сучасныя ўмовы не параўнаць з тым, з чаго пачынала наша пакаленне. Значна менш фізічнай працы, непараўнальна лепш бытавыя ўмовы, вышэйшая заработная плата... Зразумела, працоўная дынастыя накладвае дадатковую адказнасць за дарослых дзяцей на бацькоў. Прызнаюся, пастаянна хвалююся і перажываю, што скажуць пра майго сына, як ацэняць яго добрасумленнасць і прафесіяналізм. Вядома, хацелася б, каб яго хвалілі. І я рада, што ён мяне не падводзіць.

І працоўны калектыў, і кіраўніцтва Ганцавіцкага завода буйнапанэльнага домабудавання КУП «Брэстжылбуд» упэўнены ў сваёй прадукцыі і таму з упэўненасцю глядзяць у будучыню.

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.**
**Алена ДАЎЖАНОК.**
**Фота Лізаветы ГОЛАД.**

УНП 200274520


**РУП «Институт недвижимости и оценки» (Гродненский филиал)**

**информирует о проведении открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего Государственному лесохозяйственному учреждению «Ивьевский лесхоз»**

| | |
|---|---|
| **Аукцион состоится 07.04.2023 г. в 11.00 по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209. Телефон для справок: 55-87-71** | |
| **Лот № 1** | |
| **Наименование, характеристика предмета аукциона, местонахождение предмета аукциона** | **Лот № 1: лошадь рабочая, гнедой масти в возрасте 15 лет** |
| **Начальная цена продажи** | 882 руб. (восемьсот восемьдесят два рубля) с учетом НДС |
| **Сумма задатка** | 88 руб. (восемьдесят восемь рублей) |
| **Реквизиты для перечисления задатка** | BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225 |
| **Место, дата и время окончания приема заявлений** | Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 208, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед с 12.30 до 13.18. **Последний день приема заявлений – 05.04.2023 г. до 15.00** |
| Порядок оформления участия в аукционе, порядок его проведения, а также определения лица, выигравшего аукцион, содержатся в информации о проведении аукциона, опубликованной на сайте Организатора аукциона – https://grino.by/auktsiony/ | |

ОАО «Гомельжилпроект» доводит до сведения акционеров общества, что 23.03.2023 годовым общим собранием акционеров по всем вопросам повестки дня решение принято.

УНП 400022625

Информация о проведении аукциона по продаже гражданам Республики Беларусь в частную собственность земельных участков для строительства и обслуживания одноквартирных, блокированных жилых домов

в **д. Заброденье, д. Бабий Лес, д. Осово, д. Жажелка, д. Белая Лужа** Жодинского сельсовета Смолевичского района Минской области.

Аукцион состоится **29 апреля 2023 г. в 10.00** в Жодинском сельском исполнительном комитете по адресу: г. Жодино, пер. Молодежный, д. 3, кабинет № 1.

*Организатор аукциона: Жодинский сельский исполнительный комитет*

| № лота | Адрес земельного участка | Кадастровый номер | Площадь (га) | Целевое назначение | Начальная цена земельного участка (бел. руб.) |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | д. Заброденье | 624881706101000103 | 0,15 га | (1 09 02) земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома, обслуживания зарегистрированной организацией по государственной регистрации недвижимого имущества, права на него и сделок с ним, квартиры в блокированном жилом доме) | 6 000.00 |
| 2 | д. Бабий Лес | 624881700601000109 | 0,1499 | | 7 000.00 |
| 3 | д. Осово, ул. Горького | 624881710301000046 | 0,1496 га | | 7 000.00 |
| 4 | д. Жажелка, ул. Заречная | 624881705601000184 | 0,15 га | | 9 000.00 |
| 5 | д. Белая Лужа | 624881701601000142 | 0,15 га | | 7 000.00 |

Извещение о проведении аукциона размещены на сайтах Государственного комитета по имуществу: https://au.nca.by, Смолевичского райисполкома: http://www.smolevichi.gov.by.

УНП 600023532

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| Организатор аукциона, оператор ЭТП | ООО «Расантехторг», г. Минск, ул. Беды, 33, помещение 339. Адрес ЭТП: www.torgi24.by |
| Продавец | ООО «БычкоффБел», Минская область, г. Минск, ул. Каменногорская, д. 47, оф. 45 |

**Предмет электронных торгов:**

| Лот | Наименование (назначение), инвентарный номер | Начальная цена с НДС (бел. руб.) |
|---|---|---|
| 933 | **Автомобиль грузовой фургон, LADA LARGUS FS035L, 2017 г. в.,** регистрационный знак АС 2106-5, кузов № XTAFS035LJ1057514, цвет тёмно-синий | 6 000,00 |

**расположенный по адресу:**
Минская обл., Минский р-н, г. Минск, ул. Каменногорская, 47

**Размер шага** составляет **5 %** от начальной цены лота

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях перечисляется на р/с BY56UNBS30120893600010000933 в ЗАО «БСБ Банк», код UNBSBY2X, г. Минск, пр. Победителей, 23/3, УНП 191514793, получатель: ООО «Расантехторг»

**Срок подписания договора купли-продажи: 5** (пять) рабочих дней после электронных торгов

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Победитель торгов (претендент на покупку), обязан оплатить предмет аукциона в соответствии с договором купли-продажи, но не позднее 30 (тридцати) дней со дня проведения торгов, если иной срок не установлен собранием (комитетом) кредиторов

Победитель аукциона (претендент на покупку) обязан возместить затраты на проведение торгов и оплатить вознаграждение организатору аукциона в размере **5 %** от цены продажи лота в течение 5 (пяти) дней со дня проведения аукциона. Затраты на организацию и проведение электронных торгов составили: по лоту (для каждого лота) – не более 950,00 бел. руб.

**Дата и время начала торгов: 24.04.2023** в 09.00.
**Дата и время окончания торгов: 24.04.2023** в 16.00

Для участия в торгах необходимо подать заявку и пройти регистрацию в качестве участника торгов на торговой площадке **www.torgi24.by**. Прием документов на участие в торгах осуществляется организатором торгов ООО «Расантехторг» на электронную почту: **info@torgi24.by**. Срок приема заявлений на участие в торгах и оплаты задатка – с **25.03.2023 по 21.04.2023** с 9.00 до 17.00

**Контактные данные: +375 (29) 607-79-50; +375 (29) 607-76-81. E-mail: info@torgi24.by**

## ЗАО «БелБанкротАукцион»,

организатор торгов по продаже имущества **ООО «Ситимаркет»** (УНП 590765703),
объявляет о проведении **26.04.2023 г.** в 09.00
публичных торгов в электронной форме.

Перечень имущества и информация об условиях торгов размещены на сайте электронной торговой площадки: **bankrottorg.by.**

## ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) извещает о проведении открытого повторного аукциона по продаже жилого помещения государственного жилищного фонда – трехкомнатной квартиры с применением понижающего шага, находящейся в собственности Гомельского республиканского унитарного предприятия электроэнергетики «Гомельэнерго» (РУП «ГОМЕЛЬЭНЕРГО») – далее ПРОДАВЕЦ

### Дата и время проведения аукциона: 12 апреля 2023 года в 11.00
### Место проведения: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга»

| № лота | Наименование предметов торгов | Начальная цена, бел. руб. | Минимальная цена, бел. руб. | Сумма задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| **Условие продажи:** претендент (победитель) аукционных торгов самостоятельно и за свой счет после заключения и регистрации договора купли-продажи вправе обратиться за выделением и регистрацией земельного участка, необходимого для обслуживания предмета аукциона в органы государственной регистрации, а также дополнительно возмещает расходы продавцу по предпродажной подготовке | | | | |
| 1 | **Квартира № 1, инв. № 311/D-11806 в блокированном жилом доме**, назначение – квартира, наименование – квартира № 1. Адрес: Гомельская обл., Ветковский р-н, Даниловичский с/с, аг. Даниловичи, ул. Советская, 14-1. Состоит из 1/2 части кирпичного жилого дома с двумя верандами, с надворными постройками: уборной, сараем. Общая площадь 51,5 кв. м, жилая площадь 33,8. Число комнат: 3 | **33 521,74** | **6 704,35** | **670, 43** |

**ПРОДАВЕЦ:** Гомельское республиканское унитарное предприятие электроэнергетики «Гомельэнерго» (РУП «ГОМЕЛЬЭНЕРГО»). 246001, г. Гомель, ул. Фрунзе, 9.

**Порядок ознакомления с имуществом** (осмотр) осуществляется по контактному тел.: **8 (02330) 26441 – Асютин Михаил Сергеевич. Понижающий шаг аукциона – 10 (десять) % от начальной цены продажи (3 352,17 бел. руб.).**

**Желающее принять участие в аукционе лично либо через своего представителя в установленный в извещении срок обязаны:**

**1.** Оплатить задаток на расчетный счет **Организатора аукциона (ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга»):** р/с BY52 BLBB 3012 0400 0712 0400 1001, БИК BLBBBY2X, дирекция ОАО «Белинвестбанк» по Гомельской области, УНП 400071204 назначение платежа – задаток за участие в аукционе 12.04.2023 г. по лоту № 1.

**2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов **с 25 марта 2023 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00.

Прием заявлений для участия в аукционе **заканчивается 10 апреля 2023 г. в 16.00 включительно (предварительно по контактным телефонам Организатора торгов).** Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три календарных дня до его проведения. **Победитель аукциона (единственный участник несостоявшегося аукциона) обязан: в течение 10 (десяти) рабочих дней** после утверждения протокола о результатах аукциона возместить Организатору затраты на организацию и проведение аукциона, об утвержденной сумме которых уведомляется до начала аукциона; предоставить копии платежных документов, подтверждающих их возмещение; подписать с Продавцом договор купли-продажи жилого помещения **в течение 12 (двенадцати) рабочих дней** после утверждения протокола о результатах аукциона. **Продавец предоставляет рассрочку оплаты жилого помещения на 3 (три) года.**

**Условие оплаты предмета аукциона – выплатить Продавцу стоимость предмета аукциона, сформированную в установленном порядке равными долями в течение 36 месяцев (согласно договору купли-продажи).**

В случае отказа (уклонения) победителя аукциона от подписания протокола о результатах аукциона и (или) договора купли-продажи жилого помещения, а также от возмещения затрат на организацию и проведение аукциона, внесенный им задаток возврату не подлежит. При уклонении одной из сторон от подписания договора купли-продажи жилого помещения другая сторона вправе обратиться в суд с требованием о понуждении заключить договор, а также о возмещении убытков, причиненных уклонением от его подписания.

**Ранее опубликованное извещение о торгах размещено в газете «Звязда» от 16.11.2022 г. № 225 (29847).**

**Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке продажи жилых помещений государственного жилищного фонда на аукционе, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 17 ноября 2010 г. № 1695.**

Извещение о проведении аукциона размещено на сайтах: организатора аукциона – www.expert-usluga.by (раздел «Аукционы»); Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь www.gki.gov.by/ в разделе «Продажа/Аренда имущества», далее – «Продажа и аренда государственной недвижимости. Единая база».

**Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.gomeloblreklama.by, www.expert-usluga.by, раздел «Аукционы».**

**Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора аукциона: (тел./факс) 8 (0232) 23-23-54, 23-23-53, 8 (029) 651-22-19, 8 (029) 341-15-45, 8 (044) 599-18-16.**

## ООО «Фрондера» извещает о проведении публичных торгов по продаже имущества ОАО «ТРЕСТ БЕЛСТРОМРЕМОНТ» в форме открытого аукциона

| № Лота | Наименование предмета торгов | Начальная стоимость с учетом НДС 20 %, бел. руб. | Задаток, бел. руб. (10 %) | Шаг аукциона, бел. руб. (5 %) |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Бензопила Husgvarna 365-15 (без шин), инв. 505 | 345,60 | 34,56 | 17,28 |
| 2 | Вибратор, инв. 146 | 108,00 | 10,80 | 5,40 |
| 3 | Виброплита FPC60 Honda (только двигатель), инв. 757 | 237,60 | 23,76 | 11,88 |
| 4 | Виброплита FVP-110 (н/раб), инв. 716 | 35,28 | 3,53 | 1,76 |
| 5 | Виброплита PCE330-KM186F (без плиты), инв. 659 | 266,40 | 26,64 | 13,32 |
| 6 | Виброплита с ДСВ CO-310 (только двигатель), инв. 658 | 136,80 | 13,68 | 6,84 |
| 7 | Виброплита C90TH (без плиты), код 98419 | 201,60 | 20,16 | 10,08 |
| 8 | Генератор сварочный EP200X-XC-200АД (только двигатель), инв. 434 | 626,40 | 62,64 | 31,32 |
| 9 | Дрель ударная GSB 19-2 RE (н/раб), инв. 756 | 72,00 | 7,20 | 3,60 |
| 10 | Компрессор Profi 320-10 100-1, инв. 736 | 295,20 | 29,52 | 14,76 |
| 11 | Компрессор, инв. 637 | 2 520,00 | 252,00 | 126,00 |
| 12 | Компьютер CDL с монитором самсунг, клавиатура системник (н/раб), инв. 708 | 59,76 | 5,98 | 2,99 |
| 13 | Компьютер монитор Самсунг 795, инв. 436 | 30,96 | 3,10 | 1,55 |
| 14 | Компьютер, инв. 525 | 38,16 | 3,82 | 1,91 |
| 15 | Контейнер для кислор.баллонов, инв. 145 | 93,60 | 9,36 | 4,68 |
| 16 | Насос ГНОМ 16-16 220В Литва, инв. 790 | 79,20 | 7,92 | 3,96 |
| 17 | Нивелир НИ-3 (н/раб), инв. 419 | 129,60 | 12,96 | 6,48 |
| 18 | Нивелир НИ-3 (н/раб), инв. 606 | 63,36 | 6,34 | 3,17 |
| 19 | Нивелир (н/раб), инв. 597 | 63,36 | 6,34 | 3,17 |
| 20 | Нивелир (н/раб), инв. 60048-а | 71,28 | 7,13 | 3,56 |
| 21 | Ноутбук 15,6 самсунг 305E5Z РФ, инв. 761 | 144,00 | 14,40 | 7,20 |
| 22 | Ноутбук 15,6 Самсунг 305E5Z серебр. РФ, инв. 746 | 144,00 | 14,40 | 7,20 |
| 23 | Опалубка монолитных стен конте РФ, инв. 782: 1. щит 3000*1200 мм (49 шт.); 2. щит 3000*1100 мм (1 шт.); 3. щит 3000*1000 мм (3 шт.); 4. щит 3000*900 мм (1 шт.); 5. щит 3000*800 мм (2 шт.); 6. щит угловой (4 шт.); 7. анкер торцевой (4 шт.); 8. болт стяжной SAS15FC (96 шт.); 9. гайка стяжная оц 90 мм (190 шт.); 10 замок клиновый (75 шт.); 11. замок универс оц (55 шт.); 12. захват крановый «Гамма» (2 шт.); 13. кронштейн подмостей (25 шт.) | 5031,72 | 503,17 | 251,59 |
| 24 | Отбойный молоток SDS-max Макита Литва (н/раб), инв. 706 | 194,40 | 19,44 | 9,72 |
| 25 | Перфоратор GBH 4-32 DFR Герм (н/раб), инв. 777 | 266,40 | 26,64 | 13,32 |
| 26 | Перфоратор SDS plus GBH 4-32 Герм (н/раб), инв. 728 | 172,80 | 17,28 | 8,64 |
| 27 | Перфоратор SDS plus Bosch GBH 2-28 DFV Герм (н/раб), инв. 753 | 72,00 | 7,20 | 3,60 |
| 28 | Перфоратор SDS plus Bosch GBH 4-32 DFR Герм, инв. 719 | 266,40 | 26,64 | 13,32 |
| 29 | Пила цепная эл. Макита UC4020F 1800Вт попереч. двиг. н (н/раб), инв. 647 | 36,72 | 3,67 | 1,84 |
| 30 | Подъемник к-1, инв. 140 | 396,00 | 39,60 | 19,80 |
| 31 | Подъемник к-1, инв. 302 | 396,00 | 39,60 | 19,80 |
| 32 | Полуавтомат МИДИ Макстер 1800, инв. 501 | 360,00 | 36,00 | 18,00 |
| 33 | Пуско-зарядное устройство 24-12 Вт, инв. 638 | 144,00 | 14,40 | 7,20 |
| 34 | ПЭВМ Сильверадо (мышь, монит.19, клав.) без сист. комплект., инв. 500 | 28,08 | 2,81 | 1,40 |
| 35 | Сварочный агрегат (н/раб), инв. 530 | 151,20 | 15,12 | 7,56 |
| 36 | Смеситель EM1-950K (н/раб), инв. 629 | 79,20 | 7,92 | 3,96 |
| 37 | Телефакс, инв. 98 | 8,64 | 0,86 | 0,43 |
| 38 | Теодолит 3Т5КП (н/раб), инв. 794 | 367,20 | 36,72 | 18,36 |
| 39 | Углошлифмашинка Макита GA50301 (н/раб), инв. 657 | 41,76 | 4,18 | 2,09 |
| 40 | Транспортер, инв. 407 | 547,20 | 54,72 | 27,36 |
| 41 | УШМ двуручная GWS 22-230 H Bosch (н/раб), инв. 653 | 37,44 | 3,74 | 1,87 |
| 42 | Шлагбаум ASB600 Китай, инв. 760 | 302,40 | 30,24 | 15,12 |
| 43 | Котел отопительно-водогрейный, инв. 65 | 612,00 | 61,20 | 30,60 |
| 44 | Экскаватор ЕК12 (на запчасти) | 3 240,00 | 324,00 | 162,00 |
| 45 | Экскаватор ЭО-26-21 (на запчасти) | 2 700,00 | 270,00 | 135,00 |
| 46 | Станок лесопильный инв. № 37881 | 1 560,00 | 156,00 | 78,00 |
| 47 | Станок токарно-винторезный инв. № 37882 | 1 008,00 | 100,80 | 50,40 |
| 48 | Станок фуговальный инв. № 37883 | 369,60 | 36,96 | 18,48 |
